ПАГОНЯ

РЭГІЯНАЛЬНЫ АГЛЯД: ГОРАДНЯ — ВІЛЬНЯ — БЕЛАСТОК ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.


№ 21 (35) *16—22 ліпеня 1993 г.* *Кошт 5 рублёў*

Эмігрантаў нарэшце **ЗАПРАСІЛІ ДАХАТЫ.** Нататкі з І Зьезду Беларусаў Сьвету.

Талеранцыя як **ВЫНІК КУЛЬТУРЫ.** Выступленьне народнага дэпутата РБ З. Пазьняка.

БЕЛАРУСКІЯ СКАУТЫ сьвяткуюць Купальле. Рэпартаж з летніка.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ на тыдзень. Менск — Масква — Варшава.



Фота А. УЛАДАСЕВІЧА

Ліда запрашае на сьвята

25 ліпеня ў Лідзе адбудзецца хвалюючая падзея — адкрыцьцё помніка Францішку Скарыне. Дзеля гэтай доўгачаканай падзеі многае зрабіла гарадзкая суполка Таварыства беларускай мовы, якую ўзначальвае Міхась Іванавіч Мельнік, дарэчы, дэпутат вабласнога Савету.

— У 1989 годзе ў нас узьнікла думка адкрыць у нашым горадзе помнік Скарыне,— апавядае Міхась Іванавіч,— Францішак Скарына — гонар нашай нацыі, нашай дзяржавы, чалавек з сусьветным імем, шляхі якога — жыцьцёвыя й творчыя — праходзілі праз Ліду таксама. Вось Лідзкая суполка ТБМ стала ініцыятарам збору сродкаў на помнік. Ня ўсе адразу ўспрынялі прапанову, была нават цэлая дыскусія на старонках лідзкай аб'яднанай газэты. Многія пісалі: навошта нам гэтыя помнікі, навошта ўвогуле культура, трэба каўбасы й сала.

Прыкра было такое чытаць... Але людзі ўсё-такі нас падтрымалі. Дапамаглі калектывы абутковай фабрыкі, завода «Оптык». Затым мясцовыя ўлады падключыліся. Міністэрства фінансаў, аблвыканкам, гарвыканкам далі грошы. І хоць цяжкасьцяў было шмат, урэшце 25 ліпеня ў Лідзе адкрываецца помнік — помнік Скарыне — у цэнтры горада. Гэта прыгожы манумэнт, зроблены маладым беларускім скульптарам Валерыем Янушкевічам. На сьвята прыедуць прадстаўнікі урада, мясцовых уладаў, госьці з-за мяжы, вядомыя артысты, пісьменьнікі.

Пачнецца сьвята ля старажытнага замку а 10-й гадзіне. Адкрыцьцё помніка — у 22 гадзіны — з фэервэркамі, рознымі гістарычнымі атрыбутамі тае эпохі.

Дарэчы, 24 ліпеня ў Лідзе пройдзе рэспубліканская навукова-практычная канфэрэнцыя, прысьвечаная гісторыі Лідчыны.

М. ДУБРАВІН.

У амэрыканскім стылі

У загараднай рэзідэнцыі пасла ЗША у Драздах 3 ліпеня адбыўся прыём з нагоды 217-х угодкаў незалежнасьці гэтай краіны. Прыём адбываўся з 13 да 15 гадзін. Прысутнічала каля двухсот чалавек: палітыкі, дзеячы культуры, дыпламаты. У ім удзельнічалі старшыня ВС Ст. Шушкевіч з жонкай, рэктар Мастацкай акадэміі В. Шаранговіч, мітрапаліт Філярэт.

Запрошаных чакала пачостка ў амэрыканскім стылі — адзінарныя хот-догі й гамбургэры (з адной палоўкай сасіскі й адной катлетай). З напояў пераважала амэрыканскае сьветлае піва ды белае вінаграднае віно. Для аматараў мацнейшага была затым прапанавана руская гарэлка.

Цікава, што рэзідэнцыя ў Драздах у якасьці лецішча раней належала Машэраву, потым Барташэвічу, Ігрунову й, магчыма, іншым менскім партыйным босам.

Талеранцыя як вынік культуры

25—26 чэрвеня ў Менску праходзіла міжнародная канфэрэнцыя, якую наладзіў Фонд імя Льва Сапегі, прысьвечаная пытаньням талеранцыі. Мы ўжо зьмясьцілі адзін з дакладаў і нататкі пра яе. Прапануем цяпер выступленьне народнага дэпутата Рэспублікі Беларусь З. Пазьняка.

Можа здацца сімптаматычным, што канфэрэнцыя па талеранцыі адбылася ў Беларусі — краіне гістарычнай талерантнасьці й унікальных грамадзкіх узаемадачыненьняў, у краіне, якая некалькі стагоддзяў кіравалася ў сваёй дзяржаўнай дзейнасьці прынцыпам кансэнсусу (liberum veto) й па сёньняшні дзень спажывае яшчэ горкія разбуральныя плады гэтай мэханічна зразумецай ідэі й абсалютызацыі індывідуальнай свабоды.

Нашыя продкі, нашчадкі наймагутнейшай дзяржавы, стварылі ўнікальную культуру, карыстаючыся прынцыпам свабоды й цярпімасьці. Яны ж і страцілі гэтую дзяржаву, дазволілі растаптаць, расьцягнуць, абпляваць сваю культуру, давёўшы прынцып свабоды да мэханічнага ўжываньня, а цярпімасьць — да рабскага паніжэньня, якое ворагі нашага існаваньня называюць талерантнасьцю. Талерантнасьць магчымая паміж няроўнымі, непадобнымі зьявамі аднаой прыроды. Але небясьпечная талерантнасьць са злом. Бо талерантнасьць схільная да прымірэньня. Прымірэньне ж са злом амаральнае, сведчыць пра бясьсільле, вядзе да дэградацыі й выраджэньня.

Асноўныя паняцьці й іх дачыненьні вельмі важна высьветліць на ўзроўні ідэяў, каб ня мець потым клопатаў і бедаў у грамадзтве. Бо мы жывём у чалавечай супольнасьці, гэта значыць, у такім сьвеце, дзе першаснай зьяўляецца ідэя, а не быцьцё, не закон прыроды, які гэтая ідэя асэнсоўвае. Асэнсаваньне ж стала магчыма з развіцьцём культуры. Гэта тады, калі протачалавек навучыўся зьвязваць свае пражытае мінулае з будучыняй і стаў абмяжоўваць, стрымліваць сваю прыроду дзеля мэты. Такім чынам талеранцыя вынікае з гнасеалягічных падставаў культуры й зьяўляецца адной з важнейшых маральных ідэяў у чалавечым грамадзтве.

(Працяг на 2-й стар.).

Водгукі

Бог вучыў нас любіць і дзяліцца...

Чытаю газэту «Пагоня» й дзіву даюся, як абыходзяцца мясцовыя гарадзенскія ўлады з жаночым базыльянскім кляштарам.

Разумею, што гаварыць ці, болей таго, шукаць праўду чалавека ў нашай краіне ня мае сэнсу. Гэта, магчыма, калі-небудзь прыйдзе да нас з гадамі. Але ж вуніятам адмовілі на свой храм і ці ж гэта не ганьба перад Богам? Дзіву даюся, як нецярпіма ставяцца праваслаўныя вернікі да таго, каб і грэка-каталіцкая вера мела магчымасьць стаць раўнапраўнай. І самае прыкрае, што адбываецца гэта ўсё зараз на Беларусі. Якая аб'явіла сябе самастойнай і незалежнай. Вось толькі сапраўднай беларускай рэлігіі — вуніяцтву — месца ў ёй не стае.

Чуў, што зараз на Гарадзеншчыне будуюць новыя касьцёлы, храмы для татараў, і дзякуй Богу, хай моляцца людзі. Толькі ці даруе сам Усявышні тое, што запаветы яго не выконваем, дзелім не пароўну і не па справядлівасьці.

В. СЕГІНЬ, пэнсіянэр.

Эмігрантаў нарэшце запрасілі дахаты


1. Вялікі тлум у Менскай опэры

8 ліпеня. Гістарычны дзень. Над уваходам у сталічны Акадэмічны тэатр опэры ды балету — транспарант з купалавымі радкамі «На сход, на ўсенародны сход!». Сюды ўпершыню зьехалася з розных краін наша эміграцыя на Першы Зьезд Беларусаў Сьвету. На ганку людна. Спатыкаеш айца Анатоля з Каложы. У вас абодвух няма запрашэньняў. Высокія груваcткія дзьверы вартуюць сталыя мужчыны з эмблемамі БЗВ на рукавах — дружына Згуртаваньня вайскоўцаў. На вуліцы імжыць халодны дождж.

Унутры праўдзівы вавілёнскі тлум. Віруе самая вялікая ў сьвеце беларуская «тусоўка». Ты заўважаеш мноства вядомых людзей: А. Мальдзіс, З. Пазьняк, В. Целеш, В. Кіпель, а. Я. Матусевіч... Побач цябе на цэнтральных усходах сам Ст. Шушкевіч з ахоўнікам, які пільна разглядаецца навокал. Са спадаром старшынёй ВС размаўляе нейкая экзальтаваная з выгляду кабетка. Нехта падобраму жартуе: маўляў, тутака сабралася 80 працэнтаў усіх сьвядомых беларусаў сьвету.

Паўсюль велізарная колькасьць разнастайных друкаваных выданьняў, ад газэт да факсімільных кніжак і мастацкіх альбомаў. Тутака ж кэраміка, саломка, упамінкі, значкі, карціны (толькі за даляры). Але амаль ніхто нічога не купляе. Вельмі хутка пачынаеш сам адчуваць перасычанасьць усім адразу — тварамі, выданьнямі, народнай музыкай і строямі. Раз-пораз спатканьні, кароткія размовы. Але некаторыя знаёмцы нават зблізку не пазнаюць цябе, разгублена разглядаюць навокал.

(Працяг на 2-й стар.).



ГРАМАДЗТВА

Эмігрантаў нарэшце запрасілі дахаты

(Пачатак на 1-й стар.).

Адбываецца рэгістрацыя дэлегатаў. Доўгі хвост чаргі. Вольна толькі каля столікаў з шыльдачкамі «Францыя», «Аўстралія» й г. д. Сапраўды вавілёнскі тлум. Англа-, франка-, іспанамоўныя беларусы.

2. «Пагоня» ў фальклёрным выкананьні

У цэнтры прэзідыума зьлева направа спсп. Гілевіч, Краўчанка, Быкаў, Шушкевіч. На сцэне паяўляецца народны хор і замест «Мы, беларусы...» бадзёра зацягвае «Пагоню». Усе ўстаюць. Табе найбольш з усіх гімнаў даспадобы «Не загаснуць зоркі ў небе!». Хай бы сабе й «Пагоня». Аднак яе выкананьне на капыл, як гэта сьпявае народныя песьні калгасны хор, гукава дэфармуе сам твор. Гэта ўжо ня гімн, а штосьць накшталт «Бывайце здаровы!», толькі ў крыху менш вясёлым гучаньні...

3. «Мы скончаем са сваім самаедзтвам»

Першым гаварыў прэзідэнт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» народны пісьменьнік Беларусі Васіль Быкаў. Ягоны выступ як заўжды повен болю за нашыя ня надта ладныя беларускія справы. Мы страцілі некалі сваю дзяржаўнасьць разам з ліцьвінскім назовам, ці не адсюль усе нашыя беды? Нацыя ў раськіданым стане й ня толькі ў гэапалітычным сэнсе. Няма ў нас таксама адзінства ў рэлігіі.

Войны, рэвалюцыі, генацыд. Ад рук чэкістаў з энкавэдыстамі загінула ня менш люду як зьнішчылі фашысты з паслугачамі (воплескі ў залі). Трасьцянец і Курапаты — раўназначныя назвы ў нашай гісторыі.

А ячшэ нядаўна гэроі Аўганістану лупцавалі веласіпэднымі ланцугамі дзяцей, якія сьвяткавалі ў цэнтры Менска Гуканьне вясны. Купальскія вогнішчы залівалі вадой з пажарных рукавоў. Усім памятны й разгон Дзядоў у 1988 г. у Менску. Усё гэта — канвульсіі ўласнага фашызму...

Дэлегаты зьезда на хвіліну ўсталі, каб ушанаваць памяць усіх, хто загінуў за Беларусь.

Ст. Шушкевіч выказаў стрыманае захапленьне тым, што беларусы разам са сваёй эміграцыяй упершыню без падказкі й без перашкодаў сабраліся, каб абмеркаваць беларускія справы. Ён не спадзяваўся такога ў наш час, хіба што мог марыць, каб гэтай падзеі дачакаліся дзеці або ўнукі.



Др Янка ЗАПРУДНІК (ЗША)

Мы ня маем права страціць свой гістарычны шанц, які выпакутаваны пакаленьнямі, мы павінны выкарыстаць яго й пабудаваць сувэрэнную нэйтральную Беларусь. Нельга сёньня аддаваць ініцыятыву ў іншыя, «зламынныя рукі, якія цягнуцца да ўлады». Ён заклікаў усіх «за работу!».

Н. Гілевіч сказаў, што гэты тэатр ніколі не поўніўся беларускімі галасамі, як сёньня. Каб гэтак уся Беларусь загучала! Але гэта пытаньне часу. Мы ўжо скончаем са сваім самаедзтвам, але наша дзяржава яшчэ ня стала беларускай. Рэч ня толькі ў мове, але таксама ж і сто разоў у ёй. Бо справа зрушыцца, калі ўсе да аднае паперкі з Рады міністраў пойдуць на беларускай мове. Ён таксама заклікаў не выпускаць з рук ініцыятыву дзеля таго, каб антыбеларускія сілы пацярпелі поўны крах.

4. Спадары-дабрадзеі

Як вядома, на правядзеньне зьезду Урад выдзяліў 60 млн рублёў. Як пры мне выказвалі здагадкі замежныя землякі, гэтага, мабыць, як на сёньняшнія кошты, хапіла хіба толькі на рэстаран ды гатэль. Дарэчы, удзельнікі зьезду таксама вызвалены ўрадам ад аплаты візаў за ўезд і выезд з Беларусі.

Стала таксама вядома аб тым, што зьезду паступілі ахвяраваньні: ад сп. А. Селівончыка з Сібіры — 20 млн рублёў, ад прыватнай асобы са Львова — 5 млн, ад Зьнешэканамбанку — 2 млн, ад прафсаюзаў — 300 тысяч, ад калгаса «Шлях Леніна» — 100 тысяч, ад некаторых прадпрыемстваў, а таксама ад сп-ні Тарасевіч — 1000 рублёў. Цікава, што нехта з трыбуны прапанаваў калгас за гэта назваць імем Першага зьезду беларусаў сьвету. Канешне, з добрай іроніяй.

5. Урад хоча дбаць пра дыяспару

Нікога не зьдзівіла, што сп. В. Кебіч замест сябе прыслаў на зьезд свайго намесьніка сп. М. Дземчука, які зачытаў урадавы даклад. Спадар прэм´ер, безумоўна, чуўся б не ў сваёй талерцы ў гэтай грамадзе, яму давялося б таксама пачуць малапрыемныя словы на свой адрас накшталт таго, што яму зараз спрэзэнтуюць расейска-беларускі слоўнік. Ну, але гэта ўжо эмоцыі. Дзяржаўная мудрасьць, як той казаў,— па-над усім.

Дык што ж ва ўрадавым дакладзе? Па сутнасьці, гэта справаздача з некаторымі прапановамі на будучыню. Адносна Балтыйска-Чарнаморскага саюзу сцьвярджаецца, што ён будзе другарадным побач з восьсю Эўропа-Беларусь-Расея. Апроч эканомікі галоўным клопатам названа нацыянальна-культурнае адраджэньне. «На Беларусі стала больш беларускасьці, у грамадзян Беларусі паступова зьнікае комплекс непаўнацэннасьці...» «Другі вынік — мы змаглі пазьбегнуць рэвалюцыйнасьці ў вырашэньні праблем нацыянальна-культурнага адраджэньня, што непазьбежна прывяло б нас да канфрантацыі й, што галоўнае, да канфрантацыі на нацыянальнай глебе паміж прадстаўнікамі аднай, менавіта аднай (!), нацыянальнасьці, што й небясьпечна, й нязвыкла, й незразумела для міжнароднай грамадзкасьці». Гм, янычары, канешне, на ўсё здольныя...

Прынята ўрадавая праграма «Беларусы ў сьвеце». У будучыні, магчыма, будзе створаны адпаведны камітэт ці міністэрства па справах дыяспары.

5. Гаворыць эміграцыя

Мяне ня раз пыталі потым: дык у чым жа сэнс гэтага мерапрыемства, якая практычная карысьць? Ня ведаю, як накшталт выключна матэрыяльнай карысьці (хацця майму прыяцелю, сьпеваку В. Ш. нашы замежнікі ахвяравалі грошы на запіс ягоных песьняў у добрай сучаснай студыі), але галоўны вынік у любым разе дасягнуты, а менавіта — беларускую эміграцыю нарэшце запрасілі ў бацькоўскую хату. Гэткі падарунак, у бальшыні старым людзям — на сьхіле іхніх гадоў, залічыцца ў іншым жыцьці сяму-таму з нашых сталічных грэшнікаў.

Калі на Бацькаўшчыне вынішчалі беларушчыну, ператварылі нас амаль ва ўзорна-янычарскую згодніцкую нацыю, дык яны тамака, у далёкіх Амэрыцы да Аўстраліі, трымаліся за ўсё роднае, як за найвялікшы скарб, баранілі ў сьвеце нашыя мову, Пагоню, бел-чырвона-белы сьцяг, сьветлую ідэю БНР. За гэта іх «удзячна» мянавалі дома здраднікамі. Як вядома, хто галасьней крычыць...

Талеранцыя як вынік культуры

(Пачатак на 1-й стар.).

Кожная цывілізацыя, кожная сацыяльная сістэма, кожная нацыянальная культура, ці этнічная супольнасьць вырашалі гэтую праблему ў гісторыі, крышталізавалі яе ў рэлігійных, этнічных, ці палітычных прынцыпах, шукаючы аптымальнасьці. Унівэрсальныя вечнасьці ці доўгатэрміновыя падставы талерантнасьці сфармаваныя Ісусам Хрыстом і выпрабаваныя гістарычна ў хрысьціянскім сьвеце. Усе палітычныя, сьвецкія, сацыяльныя этыкі й іншыя выяўлены талерантнасьці ўлічвалі ці трактавалі па-свойму ўнівэрсальныя прынцыпы, калі прыстасоўваліся да зьменлівых сітуацыяў. Гэтая зьменлівасьць разьвіцьця прадвызначае й зьменлівасьць прыстасаваньня ўнівэрсальных ідэяў. Запозьненасьць пераменаў прыводзіць да супярэчнасьцей і нават катаклізмаў.

На мой погляд, мы назіраем пачатак такога магчымага катаклізму ў Эўропе, які паказвае на крызіс эўрапэйкай дэмакратыі. Галоўная прававая й сацыяльна-палітычная ідэя талерантнасьці, якая ўзьнікла пасьля вайны ў вольным сьвеце й якая пакладзена ў аснову цяперашніх уяўленьняў пра дэмакратыю ў Эўропе — гэта амэрыканізаванае паняцьце правоў чалавека, дзе галоўным момантам зьяўляецца палажэньне аб першаснасьці, прыярытэце правоў асобы перад нацыяй і дзяржавай. Ідэя на працягу некалькіх пасьляваенных дзесяцігоддзяў прайшла свой тыповы шлях ад дэкларацыі да ўвасабленьня ў палітыку, ад палітыкі да ўлады, ад выяўленьня ў сістэме законаў, ад улады да законаў да прымяненьня іх у грамадзтве, ад дзейнасьці заканадаўства да сацыяльных вынікаў. Цяпер мы назіраем пачатак крызісу гэтай ідэі.

Станоўчыя сацыяльныя яе вынікі — мір і дабрабыт. Эўропа аб´ядналася на дабрабыце й імкнецца да яшчэ лепшага дабрабыту, не заўважаючы, што мір паступова пачынае зьнікаць, што разам з прыярытэтам асобы зьнікае прыярытэт нацыі, а разам з тым і дабрабыт карэннай асобы, што жыве на спрадвечнай зямлі. Мільёны нацыянальных безпрацоўных саступаюць месца таннай рабочай сіле з усходу, й ад гэтага не ратуюць ніякія абмежаваньні.

Так непрыкметна, спакваля тэзіс прыярытэту правоў чалавека, зразуметы мэханічна, пачынае працаваць супраць чалавека. Гэты крызіс ўсеабдымны. Гэта крызіс сістэмы, заснаванай на прымітыўнай аднабаковай трактоўцы ідэі. Разьвіцьцё яго можа прывесьці да таго ж выніку, да якога прывёў некалі нашу цывілізацыю прынцып «liberum veto».

Непасрэдным сацыяльным наступствам эўрапэйскага крызісу ўвасабленьня ідэі прыярытэту асобы перад нацыяй могуць стаць успышкі нацыянальна-этнічных канфліктаў, а ў палітычным плане прыход да ўлады фашыстаў і права-радыкальных сілаў. Такія вось мэтамарфозы прыгожых ідэяў талеранцыі мы назіраем у мінулым і цяперашнім жыцьці. Не сумняваюся, што Эўропа знойдзе выхад з гэтага становішча. Але пакуль што там дамінуе дэмакратычны касмапалітызм, пагрунтаваны на дабрабыце й абстрактных аднабаковых ідэях, абмяркоўваючы маастрыхскія фантазіі і т. п. палітычную бэлетрыстыку.

У заключэньне хачу адзначыць, што Беларускі Народны Фронт перад прыняцьцем новай праграмы руху дастаткова прааналізаваў гэтую сітуацыю ў Эўропе й магчымыя наступствы на шляху адраджэньня Беларусі. Мы выходзім з тэзісу парытэту нацыі й правоў асобы. Канкрэтнае ўвасабленьне гэтага палажэньня будзе вызначацца заканадаўствам і палітыкай. Мы здаем сабе справу, якая агромністая праца наперадзе. Гэта праца на доўгі час. Асновай для яе могуць стаць, на мой погляд, здабыткі й маральныя каштоўнасьці нашай гістарычнай беларускай культуры талеранцыі й палітычная воля грамадзтва, здольная ўвасобіць у жыцьцё карысныя для сябе ідэі.

Шаноўныя гарадзенцы!

Нашае жыцьцё набліжаецца да таго пэрыяду, калі ўсе мы мусім вырашыць, якую з палітычных сілаў падтрымаць пад час будучых рэфэрэндумаў і выбараў. Аддаючы свой голас за тую ці іншую партыю, за таго ці іншага кандыдата, кожны чалавек спадзяецца на перамены да лепшага, найперш у жыцьці й дабрабыце сваёй сям´і. Гэта ёсьць нармальнае чалавечае жаданьне. Важна толькі, каб гэты выбар ня быў памылковым. Наш народ ужо мае горкі вопыт такіх памылак. На выбарах 1990 года, карыстаючыся нізкай палітычнай сьвядомасьцю людзей, уладу ўтрымала ў сваіх руках камуністычная намэнклятура. Да якіх вынікаў гэта прывяло — кожны з нас адчувае штодзённа. Адсутнасьць рынкавых рэформаў ва ўмовах разбурэньня адміністрацыйна-каманднай сістэмы штурхнула нашу эканоміку ў бездань. Адзінае выратаваньне — зьмена ўлады шляхам перамогі на будучых выбарах палітычных сіл, згуртаваных вакол ідэі адраджэньня Беларусі й здольных вывесьці нашу дзяржаву з крызісу.

Гэта нялёгкая задача, й рыхтавацца да яе, гуртаваць сілы трэба ўжо сёньня.

З гэтай мэтай Гарадзенская арганізацыя БНФ пачынае перарэгістрацыю сталых сяброў фронту, а таксама запрашае да супрацоўніцтва ўсіх, хто не жадае заставацца пасіўным назіральнікам у цяжкі для Бацькаўшчыны час.

Перарэгістрацыя сяброў Фронту праводзіцца па адрасу: вул. Савецкая, 10, каб. 1-а, кожную сераду й чацьвер з 18.30 да 20.30 або па тэлефоне 45-45-01 у тэты самы час.

Гарадзенская Рада БНФ.



Яшчэ й сёньня, напярэдадні падзеі й у яе часе, прасавецка-інтэраўская прэса спрабавала брахаць «паліцаі!», сплываючы злобай, як атрутай. Але марная праца! Яны ўжо прыехалі. Не да ўрада або яшчэ кагось. Да нас усіх, хто задушыў у сабе «гома саветыкуса».

Чаго ж яны жадаюць? Ды няшмат. «Каб Беларусь загаварыла па-беларуску, й яна загаворыць!» — Р. Жук-Грышкевіч, старшыня Каардынацыйнага Камітэту беларусаў Канады. А што датычыць «Беларусі ў этнаграфічных межах!», дык часам і пра гэта варта нагадаць пазбаўленым сьціпласьці суседзям, якія выдаюць сучасныя мапы са сваёй мяжой ажно да Менску. А то мы ўсе маўчым ды маўчым, а неінтэлігэнтныя людзі мяркуюць, што баімся...

7. Два ўражаньні

Што цябе, ужо звыклага на ўражаньні, усё ж аднак па-добраму ўразіла? Аповяд шэфа беларускай праграмы радыё «Свобода» В. Станкевіча пра тое, як з яго ня ўзяў грошы сталічны таксовец, бо ён размаўляў з ім па-беларуску. Падобнае мог зрабіць паляк, расеец, летувіс. Змог і беларус!

Да трыбуны ідзе З. Пазьняк, і ўся зала ўстае...

8. Спрэчкі

Сам таго, мабыць, не ўяўляючы, напачатку зьезду даў тэму для гарачых спрэчак у апошні дзень др А. Баршчэўскі з Варшавы. Перадусім, ён пераканаўча давёў, што з расейцаў ніхто дагэтуль не папрасіў у беларусаў прабачэньня за 200-гадовы гвалт русіфікацыі. Амаль ніхто з іхняй інтэлігэнцыі пісьмова не сказаў вартых словаў пра беларусаў. Горкі, праўда, напісаў: у белорусов есть хорошие ребята Колас и Купала, пишут так просто, задушевно и примитивно... Апошнюе словы фразы ў савецкі час закасавалі, й на гэтай цытаце былі абаронены дзесяткі дысэртацый.

Др Баршчэўскі выказаў сваё захапленьне асобай старшыні БЗВ М. Статкевіча й упэўненасьць, што яму быць у будучыні міністрам абароны Беларусі.

Тэма войска, расейскага паводле нацыянальнага складу афіцэрства, ганебнага загаду міністра Казлоўскага, які звольніў падпалкоўніка Статкевіча нібы за парушэньне афіцэрскага гонару, чытай: за тое, што беларускі патрыёт,— усё гэта разам з патрабаваньнем адстаўкі самога Казлоўскага надзвычай распаліла залу напрыканцы зьезда. Цікава, што супакойваў усіх ніхто іншы, як З. Пазьняк: справа не ў асобе міністра, яго могуць замяніць яшчэ горшым, а ва ўрадавай вайсковай палітыцы.

Вельмі спрачаліся (пад час круглага стала, прысьвечанага праблемам дыяспары (наконт таварыстваў «Радзіма» й «Дружба», а таксама газэты «Голас Радзімы», бо яны скампраметавалі сябе ў папярэднія гады. Патрабавалася нават спыніць іхняе фінансаваньне. Заступіліся... эмігранты. Перадусім Я. Запруднік. Спадарыня В. Рамук з Чыкага сказала, што раней газэту гэтую называлі «брахалаўкай», але цяпер яна стала іншай.

Увогуле праэкт звароту зьезда да Саўміна і ВС, які тады абмяркоўваўся, месцамі меў ультыматыўны характар, як нехта заўважыў — з жорсткімі фармулёўкамі ў духу ЦК КПБ. Я. Запруднік заўважыў, што дакумэнты трэба злагоджваць, а не наадварот. Дый наогул ня варта кусаць руку, якая дала грошы на правядзеньне зьезду. Дзяржава, што відавочна, ня можа нармальна існаваць без дыяспары...

9. Дзень аўтографаў

Для дырэктара Беларускага інстытута навукі й мастацтва ў Новым Ерку др В. Кіпеля 8-га ліпеня быў днём аўтографаў. З усіх прысутных менавіта яго кніжка пра беларусаў ЗША была прымеркавана да пачатку зьезда й стала на ім праўдзівым бэстсэлерам. Аўтар падпісваў свае кніжкі на веку піяніна, да яго стаяла чарга людзей з сінім тамком пад пахай. Каштавала кніжка 200—250 рублёў.


Цэны могуць наогул вельмі вагаліся. Кніжка Ю. Туронка «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» каштавала ад 70 да 200 рублёў...

Вельмі вялікім попытам карысталіся беларускія познамкі. Побач адбывалася пагашэньне спэцштэмпелем паштоўкі ды канвэрта з 50-рублёвай познамкай, прысьвечанай зьезду.

10. «Танк» архітэктара Лянгбарда

Як апавядаюць, наш Акадэмічны тэатр опэры ды балету быў пабудаваны ня без сымбалічнае мэты. Вонкава гмах нагадваў моцны танк, скіраваны на захад, у бок Заходняй Беларусі, тадышняй Польшчы, мяжа з якой пачыналася недалёка за Менскам. Пабудавалі яго ў 30-я гады паводле архітэктара Лянгбарда. Нам з гэтым Лянгбардам увогуле пашанцавала. Менавіта ягоныя будынкі — Дом урада, унесены ва ўсе архітэктурныя даведнікі сьвету, опэрны тэатр, Дом чырвонага байца ды каманьдзіра (сёньня — афіцэраў) рабілі навонкі Менск сталіцай.

Сёньня ён ня надта нагадвае танк, хутчэй — выдаджаным сьветла-шэрым адценьнем сваіх муроў — сьпятрэлы шкілет выкапня дзесь у манголь-скім стэпе.



А што, можа, у тыя 30-я гады тут таксама багата гаманілі па-беларуску? Ставілі спэктаклі на беларускай мове пра нацдэмаў, шкоднікаў і ворагаў народа. Усходы, паверхі, партэр і бэнуар поўніліся работнікамі ў чырвоных хустках, мужчынамі — паводле моды — у напаўвайсковых фрэнчах, ботах і галіфэ. Як яны пачуваліся сярод мармуру, люстэрак і высокіх фаянсавых пісуараў у прыбіральнях? Ня ведаю. Ведаю толькі, што запрасілі сюды беларусаў з усяго сьвету, але не паруліліся пра мыла, таму не было як вымыць рукі.

На адных дзьвярах зьмяціў «беларускую» шыльду — «нам. дырэктара па гледачу».

11. Пагоня была адно па Гальштэйнскім піве

Ня ведаю, чаму, але ні над уваходам, ні на даху, ні ўнутры — ва ўсім тэатры не было аніводнага дзяржаўнага сьцяга! Неафіцыйнае мерапрыемства, кажаце? Але ж у Амэрыцы ў любым бары нават ёсьць сьцяжок. Не было аднолькава й нашага гэрба. Нібы пацьвялілі з эмігрантаў, для якіх сымбалі так дарагія. Пагоню (крыху зьмененую) табе ўдалося адшукаць адно ў буфэце па прывабнай бутэльцы нятаннага Гальштэйнскага піва.

Паўсюдна — толькі эмблема зьезда. Яна цалкам зразумелая: шасьціканцовым крыжам, з галавой — арэолам глёбус, за якім сучасная мапа Беларусі. Увага трацiцца, калі ўсё гэта разглядаеш. Здаецца, ня надта ўдалая эмблема.

12. «Белбурнацы»

Адзін ідэялагічна спрытны наш пісьменьнік гадоў 30 таму вынайшоў гэты абразьліва-недарэчны скарот, каб абазваць шчырых беларусаў, якія не здрадзілі беларушчыне. Выназходка дужа спадабалася ў адпаведных ворганах, доўга культывавалася з мэтай агітацыі й контрпрапаганды.

Але вось яны прыехалі. БЕЛАРУСЫ. А дзе той пісьменьнік? Дзе ворганы? Адных ужо няма, другія перафарбаваліся, трэйція дзяжурылі на паверхах і залі інкогніта...

Напраўду сьмяецца той, хто сьмяецца апошнім.

Наступны зьезд беларусаў сьвету мае адбыцца за чатыры гады, магчыма, у Мірскім замку, якому якраз будзе пяцьсот гадоў.

С. АСТРАВЕЦ.

III Усебеларуская палітычная канфэрэнцыя.

Уражаньні госьця

Уражаньне 1-е, станоўчае

Добра, што сучасны нацыянальна-дэмакратычны рух на Беларусі імкнецца пасьлядоўна прайсьці ўсе неабходныя прыступкі на сваім шляху. Прынамсі, выразна бачна імкненьне захаваць пераемнасьць з колішнім беларускім рухам: гэта й разнастайныя формы сьвяткаваньня 25 Сакавіка, гэта й адраджэньне партыі са старым назовам — «Грамада» альбо газэты — «Свабода».

Праўда, з традыцыйнымі каштоўнасьцямі беларускага палітычнага скарбу, бывае, абыходзяцца ня надта пашанліва. Так, адна грамадзкая арганізацыя пампэзна абвясціла, што скліча Зьезд беларусаў цэлага сьвету, й гэты зьезд мусіць стаць спадкаемцам,— ні больш, ні менш! — Усебеларускіх Кангрэсаў. Што ж, абвясьціць можна ўсё, што заўгодна. Праблема ў тым, каб зьдзейсьніць.

Беларускі Народны Фронт разам з іншымі партыямі дэмакратычнага кірунку паставілі сабе задачу больш сьціплую — адрадзіць традыцыю Беларускіх палітычных канфэрэнцый — апэратыўных зборак дзеячоў палітычных арганізацый дзеля абмеркаваньня надзённых праблемаў. І гэта ім, бадай, удалося.

Дэлегаты й госьці канфэрэнцыі заслухалі зьмястоўныя выступы Васіля Быкава, Анатоля Сідарэвіча, Янкі Запрудніка, Зянона Пазьняка ды іншых, а таксама прынялі шэраг рэзалюцый. Не бяру на сябе трактаваць гэтыя цікавыя дакумэнты, няхай шаноўныя чытачы самі з імі пазнаёмяцца.

Уражаньне 2-е, спрэчнае.

Быць сапраўды пасьлядоўным зусім ня проста. Маё другое ўражаньне з гэтае канфэрэнцыі, што яе арганізатарам якраз не хапіла пасьлядоўнасьці.

Рэзалюцыі прынялі — добра. Але чаму ж не дайшло да распрацоўкі дэталёвых праграмаў дзейнасьці суб´ектаў нарады ў зьвязку з гэтымі рэзалюцыямі? Няўжо Слова не паклiча, не абумовіць Дзею?

Спрэчныя думкі нараджала само асяроддзе, у якім адбывалася канфэрэнцыя — маю на ўвазе будынак Тэатра Янкі Купалы. Калісьці ў гэтым тэатры глядзелі спэктакль «Цмок». Арганізатары канфэрэнцыі ці не глядзелі гэтага мудрага спэктаклю, ці проста забыліся, што ў цмока было некалькі галоваў. У «цмока», што захапіў нашую краіну, гэтых галоваў — не зьлічыць. Але як хочам забіць цмока — мусім зьбіць усе галовы. Гэтыя тэтральныя паралелі да таго, што арганізатары канфэрэнцыі назвалі яе Усебеларускай, але зьвярнулі ўвагу не на ўсе беды Беларусі. Абмяркоўваліся пераважна ўнутраныя праблемы Рэспублікі Беларусь, трохі закраналася беларуская эміграцыя, а інтарэсы тае часткі беларускае нацыі, якая, пражываючы на сваіх этнічных тэрыторыях, апынулася «за мяжой», былі цалкам з´ігнараваныя. Ніхто ж не патрабуе перагляду межаў, гаворка йдзе аб цывілізаванай духоўнай, гаспадарчай інтэграцыі. Без такое інтэграцыі далейшае існаваньне нацыі ўяўляецца спрэчным.

Добра, што хаця пад заканчэньне канфэрэнцыі адбылася спроба выправіць памылку — у выніковы дакумэнты былі ўнесены сьціплыя дадаткі — пра тое, што ў наступны раз гэтая праблема стане спэцыяльным прадметам дыскусіі, а таксама, што правы беларусаў-замежнікаў мусяць быць замацаваныя ў Канстытуцыі беларускай дзяржавы.

Спрэчнае ўражаньне засталося ў мяне й ад самой мэтоды правядзеньня канфэрэнцыі. Зноў скарыстаю тэатральныя паралелі — не канфэрэнцыя (калектыўная інтэлектуальная праца), а спэктакль. Відавочна — папярэдне папрацаваў нейкі «мазгавы трэст» і былі падрыхтаваныя рэзалюцыі. На самой канфэрэнцыі сапраўдныя дыскусіі не плянаваліся. Рэзалюцыі былі адзінадушна прынятыя.

Ня ведаю, як іншыя, а я, са сваім гасьцявым мандатам, часам пачуваўся лішнім. А можа, й непатрэбныя госьці ды ганаровыя дэлегаты на гэткіх канфэрэнцыях? Хапіла б толькі дэлегатаў-работнікаў.

С. ВІТУШКА, госьць.

Гатэль супэр-люкс

Непадалёк ад чыгуначнага вакзала, на месцы былых складоў тытунёвай фабрыкі, ідзе адбудова чатырохпавярховага будынку пад гатэль. Як стала вядома карэспандэнту «Пагоні», будынак нядаўна выкупіла вытворчакамэрцыйнае аб´яднаньне «Маналіт», яно й вядзе ўсе рэстаўрацыйныя работы.

Згодна праэкту, на месцы складоў прыкладна праз год будзе збудаваны гатэльны комплекс, адпавядаючы эўрапэйскім стандартам.

Хада па пакутах

Хадою па пакутах называюць пошукі працоўнага месца нядаўнія выпускнікі Гарадзенскага дзяржаўнага мэдыцынскага інстытута. Некаторыя з адчаю рэгіструюцца як беспрацоўныя ў цэнтры занятасьці насельніцтва. Іншыя, не паспрабаваўшы сябе на асноўнай прафэсіі, набываюць новую. Ёсьць і такія, хто ідзе працаваць на пасады малодшага й сярэдняга мэдпэрсаналу.

Дарэчы, двое сёлетніх выпускнікоў знайшлі сабе працу ў ТМА-2 Горадні, на пасадах мэдсёстраў.

Г. У.

Хачу застацца ў шпіталі

Не сьпяшаюцца пакідаць шпіталі Горадні пасьля курсу лекаў людзі сталага ўзросту. Яны ўсімі сіламі стараюцца прабыць тут яшчэ хоць адзін дзень. Некаторыя проста заяўляюць лекарам, што ў шпіталях ім значна лепей, чым у роднай хаце — тут у іх ёсьць харч, цяпло й увага.



КУЛЬТУРА

Халодны дождж у Наваградку

Усё ж неяк нязвыкла, калі сьвяты адбываюцца сярод тыдня. Парушаецца традыцыйная лёгіка жыцьця, час мінае яшчэ хутчэй і ўрэшце, калі зноў вяртаешся ў будні, пачуваешся стомленым і быццам забытым гэтым жыцьцём. Бо звычайна сьвяты — гэта мноства шматлікіх самых розных уражаньняў, асабліва калі ты ў чужым горадзе й сярод цікавых людзей, якіх сустракаеш упершыню. А яны, гэтыя людзі, блізкія й прыемныя табе, цяпер недзе далёка й, магчыма, таксама ўзгадваюць аб гэтых днях і аб табе, як і ты аб іх.

Так здарылася, што Наваградак ты ведаў толькі па кніжках, з гісторыі й яшчэ са шматлікіх аповядаў інстытуцкага сябра, з якім жыў некалі ў студэнцкім інтэрнаце й які вельмі ганарыўся сваім горадам, як і ты сваім. Праўда, я яшчэ двойчы праяжджаў праз гэты горад, але ж колькі гэта займала часу — найболей хвілін дзесяць.

На пляцы ў цэнтры, дзе засталіся толькі рэшткі мінуўшчыны, усё ж адчуваеш, што гэта некалі была сталіца. Жыве ў гэтым месцы нейкі незвычайны ўзьнёслы сталічны дух. А сябра-гісторык дадае, што з такіх вось невялічкіх гарадоў складаецца ўся Эўропа. Папросту шмат гадоў Наваградак быў савецкім, што, зразумела, наклала на яго адбітак гэтае эпохі. Толькі рэшткі замка бадай найболей не паддаюцца ніякім уплывам людзей і часу.

Наваградзкія чытаньні гэтым разам прысьвечаныя 740-ым угодкам каранацыі Міндоўга, ужо трэція па ліку. У зале дзелавая атмасфэра й прысутнічаюць большасцю толькі навукоўцы. Арганізатары, прадстаўнікі гарадзкога Савета й гісторыка-краязнаўчага музэя шчыра, нешматслоўна вітаюць удзельнікаў і з нецярпеньнем чакаюць дакладаў. На рэдкасьць, тут зацікаўленыя людзі ў тым, каб ведаць сваю гісторыю.

Праз адчыненае вакно даносіца шапаценьне лісьця, сьвежы ветрык задзьмувае ў залу, сёньня сонца, нехта здарожаны, і галава яго ківаецца, а табе крыху сьмешна, гледзячы на гэта.

Госьць з Летувы, які належыць да калегіі Міндоўга ў Вільні, ладна адзначае, што ў Наваградку шмат робіцца для адраджэньня дзяржаваў — Беларускай і Летувіскай. Ён падкрэсьлівае, што наша дзяржаўнасьць пачалася з Міндоўга. Праўда, ён нічога ня кажа аб гэтай дзяржаве, зразумела, мае на ўвазе тое, што ўсе правы на яе належаць летувісам. І таму надалей замест таго, каб распавесьці нешта тое, што датычыць гісторыі, ён па-інтэлігэнцку гаворыць аб тым, як зараз цяжка адстойваць Летуве сваю свабоду.

Вядома, ён — прадстаўнік свайго народа, й што яму да твае Беларусі. Пераканаешся ў гэтым яшчэ раз пазьней, калі за вячэрай апынішся побач з ім за адным сталом. Ён будзе апавядаць табе зноў і зноў пра свае цяжкасьці, а ты будзеш яго слухаць і думаць толькі аб сваім.

Цешыць, аднак, тое, што фундамэнтальная гістарычная навука на Беларусі набірае сваю моц, хоць і вельмі яшчэ доўга ёй да таго, каб пачуцца роўнай сярод іншых. Мой знаёмы летувіс чырванее, калі адзін з менскіх гісторыкаў заўважае на яго выступ, што беларуская дзяржаўнасьць пачынаецца не з Міндоўга, а значна раней: з Полацкага й Тураўскага княстваў, і ў яе ўжо быў пэўны вопыт. Толькі ці хутка гэта пачнуць прызнаваць усе нашы суседзі, бо заўтра ўвечары ты ўбачыш у тэлевізары, як маскоўцы падаюць аб гэтым сьвяце толькі рэпартаж з Летувы й таксама зазначаюць гэта як летувіскае сьвята. Хоць, дарэчы, так было заўсёды: ніхто з тваіх суседзяў не хацеў прызнаваць беларускую гісторыю. Ім усім гэта было невыгодна, ды й хто яе загубіў...

Зрэшты, гэтым нічога не парадзіш, беларусам патрэбна працаваць, шмат працаваць, але цяпер на сябе. Дзіўна толькі тое, што сярод беларускіх навукоўцаў яшчэ шмат вучняў Абэцэдарскага, якія таксама ня хочуць прызнаваць беларускасьці. Для іх была заўсёды толькі Русь.

Але чытаньні накшталт Наваградзкіх з часам шмат у чым зьменяць і гэта. Толькі падумалася: шкада, што цяжкай працы гісторыкаў у архівах і з рознымі дакумэнтамі ў нас недаацэньваюць, а паўсюдна й шмат балбочуць аб каўбасе.

Яшчэ перад вячэрай прыемная дырэктарка мясцовага гісторыка-краязнаўчага музэя запрапанавала паглядзець відэастужку аб Наваградку, якая здымалася ў 1931 годзе тутэйшымі габрэямі. Кіно на сорак хвілін было без гуку, але ўразіла тое, як мала засталося ад таго Наваградка.

Напярэдзе была ноч перад сьвятамі каранацыі Міндоўга. Заўтра ў горадзе вольны дзень. Сюды зьедуцца ўдзельнікі 1-га зьезду беларусаў сьвету, артысты са сталіцы, зыдуцца людзі з горада й навакольных вёсак.

Твае новыя сябры з Менску й Беласточчыны за тое, каб ісьці на замчышча, пасядзець пад сьветлаю поўняю і шматлікімі яркімі зоркамі, а не проста паспаць у гатэлі.

Нас набіраецца шмат. Ніна з Вашынгтону, якая таксама толькі сёньня прылецела ў Менск і дабралася да радзімы бацькі, частуе нас каліфарнійскім смачным віном. Яна таксама не захацела спаць, хоць здарожылася пасьля пералёту з-за акіяну. Мы сьпяваем беларускія песьні й ня можам нацешыцца, што ўсе разам тут, што заўтра сьвята, што такая прыгожая ноч і такая сьветлая-сьветлая поўня над Наваградкам. Тутэйшыя дзяўчаты, што выйшлі на нашы сьпевы, дзівяцца, адкуль мы, чаму па-беларуску кажа амэрыканка й «кто такой этот Миндовг». Ім на вуха нешта шэпча Коля з праваслаўнага брацтва трох Віленскіх пакутнікаў, і, напэўна, у яго гэта нядрэнна атрымоўваецца. А ў нас не сканчаюцца размовы й песьні і, на жаль, хутка раніца.

Сьнеданьне ў гатэлі падае прыгожая маладая дзяўчына з ільнянымі валасамі й блакітнымі вачыма, а ты глядзіш у вакно, бо там спора цыбаніць дождж. У фае стоўпілася група маладых гішпанцаў, адчуваецца, што ім студзёна, аднак яны гамоняць і ўсьміхаюцца. Іх дзяўчаты амаль усе падобны да Арынчы Санчэс. Такія яны, гішпанкі...

А дождж не змаўкае, калі час пачынаць сьвята, ён наадварот мацнее. Ты ўсё ж ідзеш без парасона, каб пабачыць, што адбываецца. На пляцы ўжо мноства людзей, іх не палохае дождж. На аўтобусах, з міліцыяй наперадзе, прыехалі беларусы сьвету. Іх па-сапраўднаму шмат з усіх кантынэнтаў. Яны таксама мокнуць, па чарзе забягаюць у музэй, а дождж робіцца ўсё большым.

Маладога Язэпа з Кліўлінда не страшыць гэты дождж, ты фундуеш яму наваградскае піва, і ён з задавальненьнем яго п`е. Ён ужо студэнт, а на Беларусі, радзіме яго бацькоў, упершыню. Задаволены ўсім, і нават дажджом, і вельмі добра, як і ўсе госьці, гаворыць па-беларуску.

Зрэшты, сьвята з замчышча перанесьлі ў Дом культуры. Тут няшмат месца, пад нагамі круцяцца тэлевізійшчыкі з тоўстымі дратамі, праз слова расейскі мат, арганізатары разсаджваюць гасьцей, а на вуліцы мокнуць ужо якую гадзіну мясцовыя людзі. Амон і міліцыянты не пускаюць іх у залу, бо не хапае месца. Быццам напалоханыя ўсім, што дзеецца, сядзяць тыя самыя гішпанцы, праўда, тут ім ужо цёпла, бо нават няма чым дыхаць.

Нарэшце зьявіўся міністр замежных спраў Беларусі П. Краўчанка. Канцэрт распачалі ўрыўкам з опэры «Князь Наваградзкі». Артысты са сталіцы ўражваюць сваім узроўнем, асабліва танцоры. Ты бачыш, як параскрывалі раты тыя самыя гішпанцы і падымаюць галовы, каб на гэта падзівіцца. А побач з табой сядзіць Валодзя з Аўстраліі, які сорак восем гадоў ня быў на Беларусі, і ўвесь час прыкрывае мокрыя вочы кінакамэрай. Ты бярэш яго за руку й па-сяброўску сьціскаеш, а ён толькі й можа адказаць, што першыя дваццаць гадоў на чужыне не распакоўваў нават чэмаданы, бо ўсё чакаў: вось-вось вернецца... Дзеці яго яшчэ ўмеюць гаварыць па-беларуску, а ўнукі ўжо не. Сорак восем гадоў. А ты ў гэты час узгадваеш заходне-нямецкага паэта Гюнтэра Эйха, які некалі напісаў: «Хораша ўсё ж жыць, нават зараз».

У перапынках мы спрабуем выйсьці папаліць на вуліцу, але гэты спорны дождж усё цыбаніць ды цыбаніць. Валодзя баіцца застудзіцца, ужо ня той узрост. А мясцовыя людзі так і мокнуць на вуліцы з надзеяй паглядзець яшчэ раз на беларусаў сьвету.

Увечары ты ўжо адзін у гатэлі й праз вакно назіраеш, як на замчышчы салютуюць вайскоўцы, але не йдзеш туды, бо ўжо й так за дзень вымак да апошняй ніткі.

А заўтра таксама дождж не сьціхне й цэлую дарогу да Горадні будзе цыбаніць у вакно аўтобуса, перашкаджаючы табе задрамаць.

М. КАРНЕВІЧ.

Летувіс — назва звышфармальная ці дражнілка?

Нядаўна я пачуў ад усходняга радыё, як нашу новую валюту называлі літасамі. Гэта таксама ж непісьменна, як бы пра вашую сказаць рублялі. Адразу ўспомнілася абрыдлае слова «летувіс» (ці «лятувіс»?), якім паўстагоддзя назад вырашылі ахрысьціць нас вашыя эмігранты — з мэтаю адмяжавацца. Ня маю нічога супраць назвы Летува,— усё ж гэта наша афіцыйная назва, так нас называюць і латышы (мо й гэта слова ўжо заменена?), і паралель Рэспубліка Беларусь — Рэспубліка Летува гучыць урачыста. Калі вы адмаўляецеся ад маскоўскіх эталёнаў — транслітэрацый Вільнюс, Каўнас — гэта выдатна. Суседзі, калі яны сапраўды блізкія суседзі (а такімі мы былі на працягу 7 стагоддзяў, пакуль не трапілі у асобныя каморы ў турме пад назвай «где так вольно дышит человек»), заўсёды маюць свойскія назвы для суседзяў. Напрыклад, па-латыску наша сталіца завецца Вільня, а вы пра такую назву даўно забыліся, калі меркаваць па шыльдах вашых аўтобусаў і цягнікоў. Калі вам сьмярдзіць маскоўскае слова «літовец» (яно ў вуснах беларуса нам таксама непрыемнае), называйце нас больш па-заходняму ліцьвінамі — нароўні з палякамі, якія не зьбіраюцца нас перахрысьціць і для якіх русіны ўсё роўна ня стануць ліцьвінамі, як бы таго не жадалі й як бы не прымерваліся да таго. Калі ж вы лічыце, што назва «ліцьвін» занадта зьвязаная з Летувай, якая даўно распалася, дык утварайце нам назву ад назвы новай дзяржавы, як гэта зрабілі латышы (па-латыску: летуветіс) і не называйце нас ані жмудзінамі, ані жамойтамі. Гэта як называць мазурамі ўсіх палякаў ці баварамі ўсіх немцаў. Або латышоў — земгаламі. Утварайце сваё, свойскае слова з дапамогаю сваіх суфіксаў, якія трэба прыкладаць да асновы слова, да кораня, але не да канчатка. Не забывайце, што літоўскаму канчатку назоўнікаў мужчынскага роду ў славянскіх мовах адпавядае нулявы канчатак. Беларуская мова засвоіла больш 800 літоўскіх (мо «летувецкіх» ці «летувінскіх») слоў, больш 2000 балцкіх, але ва ўсіх выпадках адкінула мужчынскі канчатак. За выключэньнем адзінага слова «дзіцянё» — вайкяліс. Можа, слова «летувіс» і ёсьць такое самае пацьвельваньне — ці помста за тое, што ў нашай мове вялікім імёнам прыклейваюцца канчаткі: Ленінас, Гітлеріс, Сталінас...

Тутэйшы з Новай Вільні
Валдас ВАНАЙЦІС.
Крыніцы — «ЛіМ», «Наша Ніва», «Словарь балтизмов в славянских языках».

Віленскія паведамленьні

Газавая атака. Расейскі канцэрн «Газпром» з блаславеньня вярхоўных расейскіх уладаў спыніў пастаўкі газу ў Летуву й патрабуе выплаціць 56,6 мільёна даляраў запазычанасьці. Гэтак сама спыненыя пастаўкі газу ў Эстонію (вінаватая 10 мільёнаў даляраў) і Латвію (вінаватая 4,9 мільёна). Малдова й Беларусь папярэджаныя, бо вінаватыя адпаведна па 13,9 і 76,9 мільёна.

У Летуве запасаў газу хопіць да сярэдзіны ліпеня. Каб разьлічыцца з расейскім «Газпромам», Летува мае намер скарыстаць мэтавую пазыку Сусьветнага Банку, а таксама спагнаць са сваіх даўжнікоў. Крулявецкая вобласьць Расеі, напрыклад, вінаватая Летуве 4,3 мільярда рублёў за электраэнэргію.

Абяцанкі. Як ужо паведамлялася ў «Пагоні», на нядаўняй сустрэчы прэм`ер-міністраў Летувы й Беларусі спадар Кебіч паабяцаў тэрмінова разьлічыцца з даўгамі за электраэнэргію Ігналінскай АЭС. Але 30 чэрвеня прэм`ер Летувы спадар Шляжавічус заявіў карэспандэнту ЭЛЬТА: «На жаль, прэм`ер-міністр Беларусі, які цьвёрда абяцаў выплаціць частку запазычанасьці яшчэ ў гэтым месяцы, да гэтае пары слова не стрымаў...»

Між іншым, пад час тае сустрэчы спадар Кебіч паабяцаў выдзеліць 30 мільёнаў рублёў на дапамогу беларускаму аддзяленьню Віленскага Пэдагагічнага Унівэрсітэта. Няўжо таксама абяцанкі-цацанкі...

Шляхі. Міністры шляхоў зносін Беларусі й Летувы падпісалі дамову «Аб транспартных аўтамабільных перавозках». У дамове ўрэгуляваныя ўсе асьпекты перавозак праз тэрыторыі абедзьвюх краін. Пад час заключэньня дамовы беларуская дэлегацыя наведала Клайпэду, агледзела марскі гандлёвы порт і паромную пераправу. Падпісаны пратакол аб выкарыстаньні Клайпэдзкага порту ў інтарэсах Беларусі.

Вынаходнікі. Каб ўратавацца ад імклівага росту коштаў кватэрнае платы й камунальных паслугаў, жыхары Летувы вынайшлі арыгінальны сродак — пачалі масава выпісвацца са сваіх кватэраў і такім чынам не плаціць. Паводле зьвестак Дэпартамэнта міграцыі такіх «падвешаных між небам і зямлёю» набралася ўжо дзесяткі тысяч.

Паліва. Жыхары Рокіскага раёну Летувы раптам устрывожыліся за стан свайго здароўя — у многіх пачала балець галава, іх стала ванітаваць. Прычына высьветлілася тады, калі былі праведзены аналізы паліва, якое людзі выкарыстоўвалі дзеля абагрэву дамоў. Аказалася, у свой час людзі панакуплялі авіяцыйнае газы дзеля ўсялякага іншага паліва для вайсковае тэхнікі. Пры згараньні гэтага паліва вылучаюцца моцныя атрутныя рэчывы.

«Абітура». Сёлета ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Летувы прыём абітурыентаў будзе праходзіць без уступных экзаменаў. Набіраць будуць паводле адзнакаў у атэстаце сярэдняй школы й субясэдаваньня.

Вернікі. На пачатку ліпеня ў Нацыянальным парку ў Ігналіне сабраліся нэапаганцы з краінаў Балтыцкага рэгіёну. Быў запрошаны, між іншым, і беларускі цэнтр этнакасмалёгіі «Крыўя». Паводле старажытных язычніцкіх абрадаў былі адсьвяткаваныя Дзень Пяруна, Дзень Лаймы, Дзень Пчолаў.

В. С.



ГОРАД

Тут пануе любоў да Беларусі

Да нядаўняга часу падлеткі й моладзь мелі дачыненьне да піянерскіх і камсамольскіх арганізацыяў, якія цяпер па вядомых прычынах знаходзяцца ў стане занепаду. Затое на Беларусі павялічваюцца рады скаутаў. Аб 'яднаньне беларускіх скаутаў (не блытаць з Саюзам скаутаў Беларусі) узначальвае скаут-канцлер Аркадзь Данілавіч Жукоўскі. Другі год запар у маляўнічым месцы на беразе ракі Котра яно стварае летнік.

75 скаутаў ад дзевяці да дваццаці гадоў з Горадні, Ваўкавыска, Парэчча, Ліды, Маладзечна, Баранавічаў на працягу 20 дзён маюць магчымасьць ня толькі добра адпачыць, але й паказаць свае здольнасьці, замацаваць на практыцы веды, атрыманыя пад час заняткаў у сваіх харугвах, знайсьці новых сяброў, абмяняцца вопытам. На правядзеньне гэтага мерапрыемства Камітэт па справах моладзі пры Савеце Міністраў Беларусі выдзяліў 200 тысяч рублёў, немалыя сродкі ўклаў у гэтую справу культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына».

Кожны новы дзень скауты пачынаюць з узьняцьця сьцяга на лінейцы, дзе вызначаюцца пляны, прачытаньня малітвы «Ойча наш», бо першы іх запавет — «Бог і Бацькаўшчына». Малітву аб ядзе яны чытаюць кожны раз перад тым, як сесьці за стол. З раніцы скауты працуюць у гуртках, у якіх зьвязовыя праводзяць заняткі па турызму, мэдыцыне, беларускай гісторыі й культуры. Пасьля абеду яны, калі не прадугледжаны турыстычныя выпрабаваньні, падрыхтоўка да сьвята ці пэўнага спаборніцтва, адпачываюць. Калі дазваляе надвор 'е, прымаюць удзел у спартыўных гульнях,



плаваюць на лодках. Увечары скауты ля вогнішча сьпяваюць народныя й сучасныя беларускія песьні.

У гэтым лягеры, у адрозьненьне ад піянерскага, няма абслугоўваючага пэрсаналу. Скауты самі кіруюць, прыбіраюць тэрыторыю ад сьмецьця, рыхтуюць сабе ежу, для чаго прызначаюцца дзяжурныя. І іх ніхто не прымушае працаваць. Як сказаў сп. А. Жукоўскі: «Галоўнае, каб дзеці прывыклі абслугоўваць сябе».

Многія скауты добра размаўляюць па-беларуску, астатнія жадаюць навучыцца. Яны паважаюць гісторыю й культуру Беларусі. Старэйшыя распавядаюць спаборнікам аб значных гістарычных падзеях, выдатных дзеячах Беларусі. Невыпадкова ў цэнтральным намёце — партрэт К. Каліноўскага.

Скауты шануюць беларускія традыцыі й, як некалі іх продкі, сьвяткуюць Купальле. У гэтым годзе беларускія скауты гукалі Купалінку, выратоўвалі яе ад злосьнікаў, вадзілі карагоды вакол вогнішча, прымалі ўдзел у старадаўніх беларускіх гульнях, сьпявалі, шукалі папараць-кветку, скакалі праз агонь, дзяўчаты пускалі па вадзе падпаленыя сьвечы.

У апошні дзень летніка адбудзецца прыём у шэрагі скаутаў спаборнікаў (кадэтаў), якія прайшлі паўгадавы выпрабавальны тэрмін, але «курс на выхаваньне» быў для іх менавіта тут.

А. ДУК.

Іншаземцы — людзі другога гатунку?

Зразумела, як мы будзем ставіцца да іншаземцаў, так і яны да нас. Жыхары іншых краін ужо некалькі гадоў дапамагаюць Беларусі пераадолець крызіснае становішча, прычым большасьць не патрабуе нічога ўзамен. А мы, здараецца, ставімся да іх як да людзей другога гатунку. Доказ гэтаму — прэйскурант цэн на білеты за карыстаньне атракцыёнамі ў старым парку Горадні. Ён сьведчыць, што іншаземец павінен заплаціць на 50 рублёў больш, чым грамадзянін Беларусі. Як жа быць з грамадзянамі Расеі ды Грузіі? А можа, нават у крамах зрабіць для беларусаў адны цэны, а для іншых — другія, больш высокія?

А. Д.

Новы від сэрвісу

Незвычайны для Горадні від сэрвісу прапануюць хлапчукі, якіх, калі надвор 'е дазваляе працаваць, можна штодзень сустрэць ля гатэля «Гродна». Яны займаюцца мыцьцём аўтамабіляў. За працоўны дзень заробак складае каля пяцісот рублёў на аднаго. Некалькі разоў ім пашанцавала, калі грамадзяне Польшчы разьлічаліся з імі далярамі. Сваёй справай хлапчукі зьбіраюцца займацца на працягу ўсіх летніх канікул.

А. Д.

«... Пасадка будзе аб 'яўлена дадаткова»

Які вакзал — такі й горад. Сутнасьць не мяняецца, калі, намагаючыся пусьціць пыл у вочы, будуюць мадэрновыя гмахі «на вырост», усё празмернае застаецца недагледжаным і зачыняецца.

Якое жыцьцё — такі й вакзал. Яго ствараюць ня столькі будынкі й пэроны, колькі людзкі тлум, штурханіна й няспынны мурашыны рух у розных накірунках. Вакзал — скрыжаваньне незлічоных шляхоў і маршрутаў, месца сустрэч, знаёмстваў, расстаньняў.

Нешта зьмянілася на аўтавакзале Горадні апошнім часам. Ведама, тут, як і паўсюдна, вырасьлі шапікі, што дакучліва прапануюць на кожным кроку жавальныя гумкі, цыгарэты й іншую замежную драбязу, з 'явіліся гульнявыя аўтаматы — усё гэта, з чым ужо звыклася вока. Справа ня ў гэтым. Вакзал жыве пасажырамі, гандлярамі, міліцыянтамі, асобамі, у якіх на ілбе напісана, што ня маюць яны ні пэўнага месца жыхарства, ні працы, адно толькі шнырующь сярод заклапочанага натоўпу ў пошуках свайго шанца.

Заўважаеш, што на пэронах міжгародняга вакзала амаль нікога не відаць,— кошт білетаў далёка апярэдзіў заробкі, й пасажыры карыстаюцца аўтобусам у выключных выпадках: калі сьпяшаюцца альбо калі ў месца прызначэньня нічым іншым, апроч аўтобуса, не дабярэшся. Натуральна, рэзка зьменшылася колькасьць маршрутаў: з 71 засталося ўсяго 50, шэраг маршрутаў існуе толькі выхаднымі днямі. У пяць гарадоў блізкага замежжа можна сёньня даехаць з Горадні — ў Калінінград, Вільню, Друскенікі, Каўнас і Луцк. Праўда, ў раскладзе з 'явілася і адна новая станцыя — Беласток.

— Зьніжэньне пасажырапатоку — гэта паўбяды,— гаворыць намесьнік дырэктара аўтобуснага парку па перавозках Віктар Лявонцьевіч Чыжык.— Рухомы састаў не абнаўляецца, большасьць машын падлягае сьпісаньню. Сёлета яшчэ так-сяк ад 'ездзім, а што далей будзе — невядома.

Заняпад. Скасаваныя маршруты ўскладнілі некаму жыцьцё, прымусілі адмовіцца ад звычак, перарвалі сустрэчы...

Затое на прыгарадным вакзале гарадзенцы тоўпяцца з шасьці гадзін раніцы, й не ад добрага жыцьця ці бяссоньня. Прыходзіць на вакзал за гадзіну-дзьве да адпраўленьня патрэбнага аўтобуса вымушаюць умовы: прыйдзеш пазьней — не ўваб 'ешся. Прынамсі, ў прыгарадны. У дачны — куды ні йшло. Адгадка гэтай з 'явы прыкра простая: кошт білетаў на дачных маршрутах удвая вышэй за прыгарадныя. Калі ўлічыць, што сярод дачнікаў большасьць пэнсіянэраў, разумееш, чаму людзі гадзінамі сядзяць, стаяць, таўкуцца на пэронах: лішняй капейкі плаціць за праезд яны ня маюць.

Як жа склалася такое становішча? Справа ў тым, што райвыканкам Гарадзенскага раёна, клапоцячыся аб сельскіх жыхарах, знайшоў сродкі толькі для падтрыманьня прыгарадных ліній, даваць датацыі на дачныя маршруты няма каму. Ведаючы гэта, земляробы хочуць скарыстаць з прывілеяў без штурханіны з дачнікамі. Выйсьце знойдзена лёгка: трэба зрабіць маршрут нязручным для гараджаніна. Вось і звяртаюца ў райвыканкам з просьбай зьмяніць расклад руху: перанесьці адпраўленьне аўтобуса, скажам, з васьмі гадзін на палову шостай раніцы. Хто з дачнікаў дабярэцца на вакзал у такую пару? І возіць аўтобус паветра, абураючы ў чэргах дачнікі, мауляў, езьдзяць на гарадзкім транспарце сяляне, і ніхто не чыніць ім перашкод, хаця тут датацыю аплочвае гарвыканкам з кішэні гараджаніна.

Хацелася б ухваліць клопат улады аб пэнсіянэрах, інвалідах, але відавочна й рацыя гараджаніна. Зрэшты, датацыі ніколі не былі й ня будуць сродкам дасягненьня роўнасьці й справядлівасьці. Адзін карыстаецца аўтобусам штодзень, а другі, магчыма, раз у год. Першы такім манерам возьме з бюджэту раёна тысячы рублёў, а другі — капейкі. Калі гэта й справядліва, дык толькі па камуністычнай шкале каштоўнасьцяў.

— Уявіце: 62 працэнты жыхароў карыстаюцца ільготамі на праезд у прыгарадным аўтобусе ,— гаворыць Віктар Лявонцьевіч. Датацыі, што дае райвыканкам, не стае, каб перакрыць нашы выдаткі. А дадайце сюды яшчэ ільготы для студэнтаў...

Намесьнік дырэктара разводзіць рукамі. Ніколі, нават у так званыя застойныя гады, мы не былі так блізка да камунізму, як цяпер, калі краіна «сваім уласным шляхам» крочыць да рынкавай эканомікі.

Шызы смурод валіць з-пад «ікарусаў», штурмам бяруць аўтобусы пасажыры. І ўсюды — чэргі, спрэчкі, лаянка. Адзін заўзята даводзіць, што займацца дачай цяпер не варта. Ніхто яму не пярэчыць. Мусіць, стаміліся, альбо думаюць гэтаксама.

Зусім іншы інтарэс назьбіраў і трымае натоўп каля гандлёвых палатак. Тут — торжышча для пасажыраў і ўсіх спрагнёных. І таму што справа гэта не зусім легальная, робіцца яна без мітусьні, ціха, дзелавіта. Цыгарэты, піва, гарэлка, віно пераважна надзвычай нізкага гатунку, так званае пойла ці балбанэс (вельмі трапная назва!), карацей кажучы,— усё тое, ў чым адчуваюць патрэбу раніцой людзі, тут ёсьць. І лішні раз дзівішся разваротлівасьці самадзейных гандляроў, якія нічога ня чулі пра маркентынг, але безпамылкова вызначылі месца, час і тавар, каб рабіць грошы. Палаткі яшчэ зачыненыя, міліцыянты з 'яўляцца пасьля васьмі гадзін раніцы, а жадаючых апахмяліцца ці закурыць процьма. Цэны бязбожныя, але гандаль ідзе жыва. Шархацяць «зайчыкі» й «ленінкі», адыходзяць з набыткам задаволеныя пакупнікі, з надзеяй (час абмежаваны!) заглядаюць у вочы ранішняга натоўпу гандляры.

Некаторыя з наведвальнікаў торжышча тут, за палаткамі, адразу й пьюць. Гэтыя нікуды не ад 'яжджаюць.

Прынамсі, адна гандлёвая палатка ўсё ж такі адчынілася. Можна меркаваць, што падзея гэта рыхтавалася на высокім узроўні: «каб навесьці парадак». Тут і піва, і цыгарэты па «магазінных» цэнах, але пакупнікоў, як ні дзіва, не відаць. Прадаўшчыца, быццам пахавала каго, абыякава глядзіць перад сабой, ніхто не турбуе яе. Лафа! Дзяржгандаль ува ўсёй сваёй прыгажосьці. Ні табе рэклямы, ні табе звычайнай шыльды «Піва». Канкурэнцыю з прыватнікамі такім манерам ня выйграць, калі, зразумела, не дапаможа міліцыя. І праўда, недзе а палове восьмай каля гандляроў рэзка, нібы зарыўшыся ў асфальт, спыніўся «жыгуль», з якога выскачылі два міліцыянты ў цывільным. Схапілі, ведама, першу-лепшу жанчыну, што забылася на асцярожнасьць і не пасьпела схаваць у кайстру бутэльку піва. Запіхалі цётку ў машыну, колькі хвілін патаўкліся вакол свайго легкавіка, пагрозліва пазіраючы навакол, і паехалі — графік ёсьць графік, а тут сваю справу яны зрабілі фахова.

Прыглушаны фонам, загучаў з дынамікаў вакзала бязколерны голас дыспэтчара: «... затрымліваецца па тэхнічных прычынах. Пасадка будзе аб 'яўлена дадаткова».

Аўтобус затрымліваецца... Якая драбяза, хаця й хлусня адначасова: не па тэхнічных прычынах, а па звычцы не думаць пра асобнага чалавека, які спадзяваўся паспець, ў якога цяжкае й вельмі кароткае — з-за чэргаў, лаянак і «тэхнічных» прычын! — жыцьцё. А за абяцаньні аб 'явіць пасадку дадаткова — дзякуй, якіністкі, але сэрвіс.

Б. В.

Кватэры для заможных

У занёманскай частцы Горадні па вуліцы Гагарына заканчваецца будоўля дома-прыгажуна. Вядзе будоўлю вытворча-камэрцыйнае аб 'яднаньне «Маналіт». У доме будуць кватэры на адным і двух паверхах. Па замове пакупніка кватэры такой могуць быць абсталяваны кандэцыянэрамі, аздоблены ў колеры, якія да густу гаспадару. Каштуе такая кватэра 12 тысяч даляраў.

Г. У.



ГРАМАДЗТВА

Падарожжа па фурманку

Гэтая падзея адбылася ў калгасе імя Я. Сьвердлава Пінскага раёна. Не зьбіраючы сходу й не гаворачы доўгіх прамоў, праўленьне калгаса прапанавала сялянам браць зямлю ў арэнду. Вяскоўцы бралі хто колькі адужае. Узяў больш за два гэктары ды ў дадатак ладны кавалак сенажаці й мой бацька. Але калі першы этап па разьдзелу былых калгасных палёў скончыўся, высьветлілася, што апрацоўваць атрыманыя палеткі няма чым. Хамянуліся арэндатары тудысюды, да праўленьня ня раз зьвярталіся. А тыя ім у адказ: вы цяпер уласьнікі — за трактар, за сельгасінвэнтар, за паліва плаціце ў калгасную касу, а тады мы вам дапаможам. Забедавалі «уласьнікі», хацелі ўжо зямлю назад калгасу вярнуць. Але сярод іх знайшліся кемлівыя, пачалі яны па сьметніках ды чарметах зьбіраць кінутае «народнае» дабро. Некаторыя так захапіліся, што праз пэўны час мелі самаходна-самаробныя сельскагаспадарчыя прылады. Пашчасьціла й майму бацьку, ён таксама прыдбаў са звалкі пэўны сельгасінвэнтар. Але па-ранейшаму пытаньне з рухомай сілаю было галоўным. Дзе набыць трактар ці хоць які-небудзь мотаблёк? Ня раз думаў ён бяссоннымі начамі аб гэтым. Выйсьце падказаў час — родны калгас па вясьне распачаў продаж коней. Вось тут бацька й ськеміў. Хуценька плетануў на стайню й выбраў сабе маладога жарабца, якога назваў Васькам. Але ж калі й гэтае пытаньне ўдалося агараць, выявілася новая бяда. Рухомая сіла ёсьць, прылады ёсьць, а як іх вывезьці ў поле? Не пакладзеш жа плуг ці барану сабе на плечы й не панясеш... Выйсьце было адно: трэба шукаць фурманку. Але ж дзе ты яе знойдзеш? Калгасныя даўно згнілі, каваля, каб зрабіць новую, у калгасе няма. Так бы й застаўся мой продак ні з чым. Але аднойчы, гледзячы па тэлевізары інфармацыйную праграму, бацька учуў, што ў Шчучынскім раёне ёсьць завод, які па наяўнаму й безнаяўнаму разьліку прадае тыя самыя фурманкі. Нядоўга думаючы, ён асядлаў Ваську, узяў грошы, прыхапіў харчу й рушыў у дарогу. Калі красавіцкай раніцой непадалёк сваёй гарадзкой кватэры я ўбачыў вершніка, то вачам сваім не паверыў. На кані ганарова ўзвышаўся мой бацька й задаволена ўсьміхаўся. Аказалася, што каб даехаць з Пінска да Горадні на кані, спатрэбілася аж чатыры дні. На пытаньне, дзе ж ён начаваў з канём, быў адказ: сьвет не бяз добрых людзей. Начаваў па вёсках, звычайна выбіраў тыя, дзе бачыў царкву. Гаспадары вясковых хат ахвотна бралі падарожніка на начлег. А калі даведваліся пра тое, з якой нагоды ён падарожнічае, прымалі, як дарагога госьця.

Асабліва запомнілася бацьку вёска Ёдчыкі Пружанскага раёна. Гаспадар хаты, у якой ён прыпыніўся, даведаўшыся пра турботы, вельмі расчуліўся, казаў, што гэтыя бальшавікі ня здольны дапамагчы чалавеку, а толькі здольны маніць ды красьці.

Пераначаваўшы ў Горадні, бацька накіраваўся да Шчучына. Разам з ім, але на легкавіку, паехаў і я. Толькі пад вечар даехаў ён да пажаданай вёскі Вялікае Мажэйкава, дзе яго чакаў воз і некаторыя сельскагаспадарчыя прылады.

Возам бацька быў задаволены, ён пастукваў кійком па гумовых апонах і казаў: «Вось гэта тэхніка! Зімой і летам будзе выручаць».

Ваську запрэглі ў фурманку, на якой утульна ўладкаваўся бацька. Ён турзануў лейцамі каня, крануўся. Раменныя папругі паскрыпвалі, а бацька ад задавальненьня засьпяваў. Я правёў яго за вёску, там мы разам вызначылі яму новы маршрут. На гэты раз шлях ляжаў праз Навагрúдчыну, бо так было бліжэй. Праз некалькі дзён пасьля пакупкі бацька затэлефанаваў мне з дому, сказаў, што ён выдатна даехаў. Толькі было адно невялічкае здарэньне. Бліз Баранавічаў Васька згубіў падкову. Дапамаглі яму ў бядзе вясковыя людзі, жыхары вёскі Вышкава. Яны бязплатна далі падкову й дапамаглі падкаваць каня. Далей бацька паведаміў, што ён навазіў ужо дроў на новай фурманцы, нават пазычаў яе сваім аднавяскоўцам. Тыя хваляць бацьку за кемлівасьць і таксама зьбіраюцца паехаць у далёкае падарожжа за пакупкамі.

Г. У.



Фота А. МАКАРАВА.

СМБ падтрымліваюць дзядзькі з Саўміна

У чэрвені ў Горадні ладзілася справаздачна-выбарчая канфэрэнцыя Саюза Моладзі Беларусі. Калі дакладней, то канфэрэнцыя былых камсамольцаў, якія хуценька зьмянілі сваю назву. Усяго з вобласьці набралася 37 дэлегатаў, адданых ленінцаў, а таксама прысутнічаў госьць ЦК — уражэнец Горадні А. Фядута. Сярэдні ўзрост у маладзёнаў — 27 гадоў, сярод іх адзін студэнт і адзін школьнік.

Як зазначыў першы сакратар абкама СМБ А. Дзікевіч у сваім справаздачным дакладзе, пасьля жнівеньскіх падзей 1991 года з боку ўладаў розных узроўняў супраць СМБ быў прыняты шэраг такіх дзеяньняў, якія ня толькі абмежавалі дзейнасьць, але й аказалі дрэнны ўплыў на далейшы лёс арганізацыі. Менавіта тады значна скарацілася членская база, пагоршылася фінансавае становішча, а гэта, у сваю чаргу, прывяло да рэзкага скарачэньня кадраў. Сёньня, бачыце, у некаторых раёнах сакратары СМБ працуюць выключна на грамадзкіх пачатках.

Адзін з галоўных шляхоў для выратаваньня становішча — вызваленьне лідэра, каб сакратары абавязкова займалі нядаўна ўведзеныя пры гарадзкіх і раённых выканкамах пасады загадчыкаў аддзелаў па рабоце з моладдзю й пры гэтым атрымлівалі там грошы, а палітыку ажыцьцяўлялі б СМБ. Таму што, як неадноічы падкрэсьлівалася выступанцамі, з моладдзю яны ўмеюць працаваць пасапраўднаму, пафэсійна.

Адно з важнейшых пытаньняў — падрыхтоўка да выбараў, хоць СМБ арганізацыя грамадзкая. Але дэлегаты вырашылі, што трэба ўступіць у блёк з тымі, хто падзяляе іх ідэі. А падзяляе іх ідэі толькі КПБ.

Таварыш з ЦК запэўніў, што ня ўсё яшчэ страчана, бо ў Саўміне да іх ставяцца даволі лагодна й пад некаторыя праграмы й мерапрыемствы па працы з моладдзю, якія яны распрацавалі, выдзяляюць сродкі. З гэтага трэба абавязкова скарыстаць, каб аднавіць работу асабліва сярод вучняў школ.

Дасталося крыху крытыкі ў бок гарадзенскай газэты «Молодежный курьер», заснавальнікам якой зьяўляецца СМБ. Маўляў, прапагандуюць сэкс, а не ідэі Леніна. Аднак рэдактара Л. Ластачніку зноў абралі ў бюро.

Урэшце ў прынятай рэзалюцыі былыя камсамольцы вырашылі, нягледзячы на цяжкасьці з фінансамі, прымаць канкрэтныя меры па арганізацыйнаму ўмацаваньню Саюза моладзі. Зноў першым абраны А. Дзікевіч, які пры вабласным савеце займае зараз пасаду загадчыка аддзела па рабоце з моладдзю.

(ав).

Фонд «Шаулічы»

Пяцьдзесят гадоў назад, у ліпені 1943 года фашысты зьнішчылі жыхароў вёскі Шаулічы, што на Ваўкавышчыне. Вёска пасьля так і не адрадзілася. Аб той трагэдыі нагадвае сёньня мэмарыяльны абеліск.

Кожны год 7 ліпеня прыяжджаюць сюды людзі ня толькі з Ваўкавыска, але й з іншых раёнаў Беларусі, каб ушанаваць памяць ахвяр вайны. На гэтым тыдні тут адбыўся жалобны мітынг. Былі ўскладзены вянкі й кветкі, прагучалі словы аб тым, што трагэдыю спаленай вёскі нельга забыць. Нельга забыць злачынствы фашызму. Гэта як вечны напамінак аб тых жахах, якія нясе вайна.

Мэмарыяльны абэліск у Шаулічах патрабуе пастаяннай увагі й клопату. Па рашэньню прэзідыума раённага Савета народных дэпутатаў створаны фонд «Шаулічы», у які будуць паступаць добраахвотныя грашовыя складкі. Разьліковы рахунак фонду — 000142104 у Ваўкавыскім аддзяленьні Аграпрамбанка. Першыя дзесяткі тысяч рублёў паступілі ўжо ў фонд «Шаулічы» ад прадпрыемстваў і арганізацый Ваўкавыска.

М. ДУБРАВІН.

Нядзельныя замалёўкі

Гарадзенскі рэчавы рынак... Сюды ў выхадныя дні прыяжджае вялікая колькасьць людзей з усіх рэгіёнаў былога Саюза, сюды з самага ранку едуць у перапоўненых аўтобусах і тралейбусах гарадзенцы. Што іх вабіць тут? Магчымасьць па больш нізкім кошце, чым у іншых месцах, купіць рэчы іншаземнай вытворчасьці, каштоўней прадаць набытае ў дзяржаўных крамах? Тут прапануюць усё, што душа пажадае: ад нітак і ношанага абутку да складанай хатняй тэхнікі й аўтамабіляў. Мала што зьмяняецца на торжышчы: у залежнасьці ад пары года — асартымэнт абутку й адзеньня, у залежнасьці ад надвор'я — колькасьць пакупнікоў і гандляроў, у залежнасьці ад сэзону, моды, інфляцыі — кошты на рэчы. Здаецца, ніхто й нішто ня зможа парушыць сам сабою наладжаны парадак.

Мінулая нядзеля была падобная да папярэдніх. З ранку гандляры занялі свае месцы, расклаўшы тавар хто на лаўках, хто на капотах легкавікоў, хто проста на зямлі, падклаўшы газэту, стварыўшы гэтым своеасаблівы лабірынт, па якому рухаецца паток пакупнікоў. Свой пачатак ён бярэ ад прыпынку грамадзкага транспарту. Паволі ідучы (бо хутка немагчыма) у гору, пакупнікі знаёмяцца з разнастайнымі ўзорамі вырабаў, якія ім прапануюць вынаходлівыя камэрсанты. Гандаль вядзецца таксама вакол агарожы, уздоўж чыгуначнай каляі, непадалёк могілак. На падыходзе да торжышча сустракаеш жабракоў, зборшчыка ахвяраваньняў на будаўніцтва праваслаўнага храма, гурт юнакоў, якія сьпевамі й музыкай зарабляюць грошы. Некалі бяз іх не абыходзіўся ніводны кірмаш, яны ж сталі неад'емнай часткай «таўкучкі».

Гандляры паводзілі сябе па-рознаму. Адны ставяцца да кожнага пакупніка дабразычліва, ня супраць паразмаўляць, могуць таньней прадаць рэч, дапамогуць, калі трэба, прымерыць і абавязкова запэўніць, што, не набыўшы яе, вы нават

(Працяг на 8-й стар.).



19, ПОНЕДЕЛЬНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

17.05. «Мастацкі музей». Тэленарыс. **17.30.** Навіны. **17.40.** Над Нёманам. Праграма на польскай мове. (Гр.). **18.00.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **18.30.** Веснік гарсавета. На пытанні гледачоў адказвае галоўны архітэктар г. Гродна У. А. Лытаў. Прамая лінія. **19.10.** «Дзедка за рэпку». Парады агароднікам. **19.40.** «Сарказм трагізму». Да 100-годдзя пісьменніка А. Мрыя. **20.25.** «Фантазія». Кінанарыс. **20.35.** Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.30.** Пад купалам сусвету. **21.40.** Спартыўны тэлекур ´ер. **22.00.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **22.30.** «Вазьму твой боль». Мастацкі фільм. **23.55.** НІКа.

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

17.00, 20.00, 23.00. Новости. **17.25.** «Липецкая аномалия — поиски согласия». **17.55.** Погода. **18.00.** Финальный матч 1-го чемпионата Международной профессиональной баскетбольной лиги. Спартак (Санкт-Петербург) — Жальгирис (Каунас). **19.40.** Спокойной ночи, малыши. **20.40.** Я знаю силу слов... К 100-летию со дня рождения В. В. Маяковского. **21.30.** Новая студия представляет: Бомонд, Жизнеописание, Мегамикс, Монтаж. **23.25.** Последний киносеанс. Художественный фильм «Декалог-Ш». **00.55.** Пресс-экспресс.

КАНАЛ «РОССИЯ»

15.05. Бизнес в России. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Премьера многосерийного документального фильма «Дикая природа Америки». (США). **16.15.** Трансросэфир. «Остров». **17.00.** Вход со двора. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55, 19.20, 21.55.** Реклама. **19.00, 22.00.** Вести. **19.25.** Детектив по понедельникам. «Лаки Страйк» представляет художественный фильм «Радиоактивные осадки». **20.20.** Джентльмен-шоу. **20.55.** Экспоцентр представляет. **21.00.** Без ретуши. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Ваше право. **22.50.** Спасение 911. **24.45.** «Каунтдаун». Новости популярной музыки.

ПОЛЬША-I

13.00. Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Династия». Серия 197. **14.15.** Лето. **16.00.** Английский язык для детей. **16.15.** «Князь Дакала». Сериал пр-ва Англии. **16.40.** «Неустрашимые». Сериал пр-ва Канады. **17.05.** Программа для подростков. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспрэсс. **18.20.** Журнал репортеров. **19.00.** Комедийный сериал пр-ва США. **19.30.** Журнал репортеров. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.00.** Прямо из Бельведера. **21.25.** Фестиваль польского телевизионного творчества. **22.40.** Миниатюры. **23.45.** Новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.05.** Вечер с героем. **00.45.** Горячая линия. **01.00.** «Железный Густав». Сериал пр-ва Германии. **02.00.** Музыкальная программа. **02.30.** «Дела семейные». Сериал пр-ва Италии.

20, ВТОРНИК

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 21.30.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Вазьму твой боль». Мастацкі фільм. **9.55.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **10.20.** У «Дынама» — юбілей. Некалькі эпізодаў з жыцця фізкультурна-спартыўнага таварыства. **11.00.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **11.30.** На шляху да незалежнасці. Перадача 1-я. **11.55.** «Партрэт на фоне замка». «Бярэсце. Сустрэча з мінулым». «Маё Палессе». Дакум. фільмы. **12.45.** «У старой скрыні». Мультфільм. **12.55.** Да Дня незалежнасці. «Край», Беларусь: погляд у мінуўшчыну. **13.30, 17.30.** Навіны. **13.40.** «Доўгая дарога у дзюнах». Мастацкі фільм. 6-я серыя. **14.50.** «Маналог з адступленнямі». Тэлефільм. **15.20.** «Вяселле Крачынскага». Музычны фільм. 1-я серыя. **16.25.** Сізбар-топ-10. **17.40.** «Заліў Пятра Вялікага». Тэлефільм. **17.55.** Размова з нагоды. Жывём на зямлі адной. (Гр.). **18.20.** Вячэрні канал. Інфармацыйна-музычная праграма (Гр.). **19.10.** Мост. Культурна-асветніцкая праграма. **19.40.** Эканамічная хваля. «Пасля балю». Аб працаўладкаванні выпускнікоў школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў рэспублікі. Прамая лінія. **20.35.** Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.40.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **22.10.** «І зорка з зоркаю гаворыць...» Прэзентацыя культурна-спартыўнага цэнтра «Трыумф». **23.10.** НІКА. **23.25.** Студыя «Тэлесябрына» «Будзьце з намі».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00. 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** «Утро». **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** «Мы рисуем». Мультфильм. **8.30.** Человек и закон. **9.00.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **9.50.** «Суперчувство». Научно-популярный фильм. 5-я серия. **10.20.** Концерт ансамбля русских народных инструментов «Финист-балалайка». **10.50, 00.15.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Гостья из будущего». Художественный фильм. **12.25.** «Путь Героина». Художественный фильм. (Англия). **13.15.** «На масленице». Мультфильм. **13.35.** «Пролетая над Парижем между Пермью и Москвой». **14.25.** Деловой вестник. **14.40.** Мир денег Адама Смита. **15.10.** Блокнот. **15.15.** «Пчела Майя». Мультфильм. **15.40.** Премьера документального фильмаа «Анри Матисс». **16.10.** Новые имена. **16.50.** Технодром. **17.25.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Стороны света». **17.50.** Погода. **18.00.** Премьера художественного телефильма «Просто Мария» (Мексика). **18.45.** Азбука собственника. **18.55.** Тема. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Премьера художественного телефильма «Азбука любви». 14-я серия. **21.10.** Художественный фильм «Дворянское гнездо». **22.35.** Рок-н-ролл ТВ. **00.20.** «Суперчувство». Научно-популярный фильм. 5-я серия.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.20.** Телевизионная биржа труда. **7.30.** Время деловых людей. **8.00.** Без ретуши. **11.00.** Домашний экран. Художественный фильм «Санта-Барбара». 193-я серия. **11.50.** Наш сад. **12.20.** Театр одного художника. Л. Соломаткин. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Дневной сеанс. «Соловей». Художественный фильм. **14.45.** Мульти-пульти. «Ружье и удочка». **15.00.** Телебиржа. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Студия «Рост». «Чья сторона?». **16.15.** Трансросэфир. «Поволжье». **17.00.** Хранители истины. «Фантомы Бориса Энгельгардта». **17.30.** Хроника национальной политики. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55.** Реклама. **19.20, 21.55.** Реклама. **19.25.** Домашний экран. Премьера художественного телефильма «Санта-Барбара». 194-я серия. **20.15.** Аз есмъ». Пушкинская, 10. **21.00.** Отечество мое. «Преображение». **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Давайте разберемся. **22.50.** Эти старые, старые ленты. **23.20.** От авангарда до наших дней. **23.55.** Концерт джазовой музыки.

ПОЛЬША-I

13.00. Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Полицейский и прокурор». Сериал пр-ва США. **16.15.** «Князь Дакала». Сериал пр-ва Англии. **16.40.** «Неустрашимые». Сериал пр-ва Канады. **17.05.** Для детей. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Спортивная студия. **19.00.** «Спенсир». Сериал пр-ва США. **19.30.** Студия спорт. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **20.55.** 7 минут для министра труда. **21.15.** «Полицейский и прокурор». Сериал пр-ва США. **22.05.** Только в первой программе. **22.55.** Открытый чемпионат Польши в парном танце. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.05.** Документальный фильм. **00.55.** Горячая линия. **01.05.** Телефильм воспоминаний. «Марсиане». **01.55.** Телетеатр. «Квартет».

21, СРЕДА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 21.30.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Ігар Уладзіміравіч Ільінскі. Урокі жыцця». Тэлефільм. **9.20.** «Кола лёсу». Кінанарыс. **9.30.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **10.00.** «На шляху да незалежнасці». Перадача 2-я. **10.20.** Кінанастальгія. «Настаўнік». Мастацкі фільм. **12.15.** «Быў. Есць. Буду». Паэзія Уладзіміра Караткевіча. **12.55.** Да Дня незалежнасці. «Край». Іосіф Гашкевіч. **13.30.** Навіны. **13.40.** «Доўгая дарога ў дзюнах». Мастацкі фільм. 7-я серыя. **14.50.** «На варце прыроды». Тэлефільм. **15.05.** «Вяселле Крачынскага». Музычны фільм. 2-я серыя. **16.10.** Для школьнікаў. «У сераду і суботу...» Тэленарыс. **16.25.** Відэьма-навідэьма. Навіны кіна-відэа-аудыё. **17.25.** Дзённік Прынёмання. (Гр.). **17.35.** «Арадніца». Літаратурна-мастацкая праграма. (Гр.). **18.35.** Лідская панарама. **19.00.** Абласныя навіны (Гомель). **19.10.** «Крок». Кавярня «Пяці зорак». **19.55.** «Ці захоча ўнук героем стаць? **20.35.** Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.40.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **22.10.** «Кожны дзень і ўсё жыццё». Памяці піяніста і педагога Р. Шаршэўскага. **23.00.** НІКа. **23.15.** Творчае маладзёжнае аб ´яднанне «Крок».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 22.45. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** «Утро». **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **9.10.** Торговый мост. **9.40.** Ассоциация детского телевидения представляет программу «Хочу стать звездой». **10.20.** «Азбука любви». Художественный фильм. 14-я серия. **10.50, 01.25.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Гостья из будущего». Художественный телефильм. **12.25.** «Путь героина». Художественный телефильм. **13.15.** Мелодии и ритмы народов Дагестана. **14.25.** Телемикст. **15.10.** Блокнот. **15.15.** «Пчела Майя». Мультфильм. **16.05.** Беседы с епископом Василием (Родзянко). Передача 12-я. **16.20.** Премьера мультфильма «Летающий дом». **16.50.** «Технодром». **17.25.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Знакомые незнакомцы». **17.50.** Погода. **18.00.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **18.45.** «Миниатюра». **19.00.** ТВ-версия. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Премьера художественного фильма «Азбука любви». 15-я серия. **21.10.** Международный конкурс популярной музыки «Юрмала-93». **21.40.** Студия «Око» представляет премьеру документального фильма «За девять лет до конца войны». Фильмы 1-й и 2-й. **23.05.** Международный конкурс популярной музыки «Юрмала-93» (продолжение). **00.35.** Футбол. Чемпионат России. «Динамо» (Москва) — КамАЗ. 2-й тайм.

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.20.** Телевизионная биржа труда. **7.30.** Время деловых людей. **8.00.** Паралелли. **8.15.** Отечество мое. «Преображение». **9.10.** «От авангарда до наших дней». **9.45.** Совершенно секретно. **10.40.** Мелодия на два голоса. **11.10.** Домашний экран. Художественный телефильм «Санта-Барбара». 194-я серия. **12.00.** Хранители истины. «Фантомы Бориса Энгельгардта». **12.30.** Антракт. Поет Игорь Саруханов. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Дневной сеанс. «Алые маки Иссык-Куля». Художественный фильм. **15.00.** Азы карьеры. **15.15.** Сигнал. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Трансросэфир. «Дальний Восток». **16.30.** Христианская программа. **17.00.** «Очаровательная и искрометная». Ольга Андровская. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55, 19.20, 21.55.** Реклама. **19.25.** Домашний экран. Премьера художественного фильма «Санта-Барбара». 195-я серия. **20.25.** Сам себе режиссер. **20.55.** Экспоцентр представляет. **21.00.** Студия «Nota Bene». **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **23.25.** Звездный дождь. **23.35.** Баскетбольное обозрение.

ПОЛЬША-I

13.00. Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Профессия — полицейский». Сериал пр-ва США. **14.15.** Путешествие в мир искусства. **14.45.** Телепластикон. **15.00.** Документальный фильм. **15.30.** Сумасшествия медицины. **15.40.** Так, как в кино. **15.55.** Портреты. **16.05.** Английский язык для детей. **16.15.** «Князь Дакала». Сериал пр-ва Англии. **16.40.** «Неустрашимые». Сериал пр-ва Канады. **17.05.** Программа для детей. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Публицистическая программа. **19.20.** «Клиника в Шварцвальде». Сериал пр-ва Германии. **19.45.** Порядок вещей. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** Спортивная студия. **22.10.** Концерт. **23.00.** Репортаж. **23.45.** Новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.05.** Вечер с... **00.45.** Горячая линия. **01.00.** «Красная мафия». Фильм пр-ва Франции. **02.30.** Джаз-программа. **02.40.** «Красная мафия». Документальный фильм.

22, ЧЕТВЕРГ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 21.30.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Да вас, сучаснікаў мае». Тэлефільм. Частка 1-я. **9.25.** «Спявае Герард Васільеў». Фільм-канцэрт. **9.40.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **10.10.** «На шляху да незалежнасці». Перадача 3-я. **10.35.** «Чужая бацькаўшчына». Мастацкі фільм. **12.00.** «Партрэт у доўг», «Маўклівая». Тэлефільм. **12.30.** Роднае слова. Тэлечасопіс. **13.00.** Да дня незалежнасці. «Край». Саламея Русецкая. Лекарка з Навагрудка. **13.30.** Навіны. **13.40.** «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Мастацкі фільм. 1-я і 2-я серыі. **15.50.** «Дакладнасць прызямлення», «Семая найлепш». Тэлефільмы. **16.40.** Для школьнікаў, літаратурныя сустрэчы. Часопіс «Першацвет». **17.25.** Прэм ´еры кіно. **18.30.** Навіны Бі-бі-сі. **19.00.** Абласныя навіны (Гр.). **19.10.** Зачытайце маё пісьмо... **19.15.** Надзея. Пра чалавечнасць і міласэрнасць (Гр.). **19.45.** Пазіцыя ўрада. Актуальнае інтэрв ´ю. **20.00.** Якія мы гаспадары? Да 30-годдзя Мінскага маторнага завода. **20.35.** Кантакт: адрасы, прапановы, інфармацыя. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.40.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **22.10.** НІКа. **22.30.** Урачыстае адкрыццё ІІ Міжнароднага музычнага фестывалю «Славянскі базар».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** «Утро». **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** «Посмотри, послушай...». **8.40.** Премьера художественного фильма «Просто Мария». (Мексика). **9.30.** В мире животных. **10.20** «Азбука любви». Художественный телефильм. 15-я серия. **10.50, 00.30.** Пресс-экспресс. **11.20.** «Гостья из будущего». Художественный телефильм. **12.25.** «Путь героина». Художественный фильм. **13.15.** «Потя и Потиха», «Несколько страниц из жизни призрака». Мультфильмы. **13.35.** «Пролетая над Парижем между Пермью и Москвой». **14.25.** «Телемикст». **15.10.** Блокнот. **15.15.** «Пчела Майя». Мультфильм. **15.40.** Беседы с епископом Василием (Родзянко). Передача 13-я. **15.55.** Таланты и поклонники. **16.45.** ... До шестнадцати и старше. **17.55.** Погода. **18.00.** Премьера художественного фильма «Просто Мария» (Мексика). **18.45.** Кинопанорама. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Лотто «Миллион». **21.10.** Студия «Око» представляет премьеру документального фильма «За девять лет до конца войны». **22.10.** Международный конкурс популярной музыки «Юрмала-93».

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.20.** Телевизионная биржа труда. **7.30.** Время деловых людей. **8.00.** Утренний концерт. Шоу-балет «Тодес». **8.15.** Студия «Nota Bene». **9.10.** У Ксюши. **9.40.** «К-2» представляет: «Наш человек в НХЛ». **10.35.** Досуг. «Дело мастера боится». **10.50.** Домашний экран. Художественный телефильм «Санта-Барбара». 195-я серия. **11.40.** Поют драматические актеры. На конкурсе имени Андрея Миронова. **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** РТВ избранное: «Белая ворона». **14.25.** Золотая шпора. **14.55.** Русская виза. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Студия «Рост». «Уроки космоса». «Внимание дети». **16.15.** Трансросэфир. «Штрихи к портрету». **17.00.** Мир и война. **17.30.** М-трест. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55.** Реклама. **19.20, 21.55.** Реклама. **19.25.** Домашний экран. Премьера художественного телефильма «Санта-Барбара». 196-я серия. **20.15.** Хроно. В мире авто-и мотоспорта. **20.45.** «ЭКС». Экран криминальных сообщений. **21.00.** Кабаре «Околесица». **22.20.** Автомиг. **22.25.** Спортивная карусель. **22.30.** Торжественное открытие ІІ Международного музыкального фестиваля «Славянский базар». **00.40.** Звезды говорят.

ПОЛЬША-I

13.00. Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Клуб парадайс». Сериал пр-ва США. **14.15.** Документальный фильм. **15.00.** Пятнадцать минут с медициной. **15.20.** Из брюха кита. **15.35.** «Обезьяны». Документальный сериал. **16.15.** «Князь Дакала». Сериал пр-ва Англии. **16.40.** «Неустрашимые». Сериал пр-ва Канады. **17.05.** Программа для детей. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Культурно-публицистическая программа. **19.00.** Важнейшие события XX века. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «Клуб парадайс». Сериал пр-ва США. **23.25.** Что нового. **23.45.** Хозяйственные новости. **00.05.** Музыкальная программа. **00.10.** Документальный фильм. **00.45.** Горячая линия. **01.00.** Голос отца. **01.05.** «Каменные таблицы». Сериал пр-ва Польши. **03.25.** «Контракт Кальтенбаха». Сериал пр-ва Германии.

23, ПЯТНИЦА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 21.30.** Пад купалам сусвету. **8.25.** «Да вас, сучасніки мае...». Тэлефільм. Частка 2-я. **9.30.** «Дзяжурная аптэка». Мастацкі фільм. **10.00.** «На шляху да незалежнасці». Перадача 4-я. **10.30.** Пазіцыя ўрада. Актуальнае інтэрв ´ю. **10.45.** «Маці Ісуса». Мастацкі фільм. **12.10.** «Трансплантацыя душы». Тэлефільм. **13.00.** Да Дня незалежнасці. «Край». Казімір Сямяновіч і яго ракеты. **13.10.** «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Мастацкі фільм. 3-я і 4-я серыі. **16.00.** «У імя і на карысць». Тэлефільм. **16.40.** Дзённік Прынёмання (Гр.). **16.50.** Толькі па пятніцах. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма (Гр.). **17.40.** Тэлевізійная дошка аб ´яў. **17.50.** «Мастак Шчамлёў. Вясёлка жыцця». Кінанарыс. **18.00.** Міжнародны музычны фестываль. «Славянскі базар». Канцэрт. І тур. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.40.** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-93» (Мінск) — «Фандок» (Бабруйск). 2-гі тайм. **22.30.** ІІ Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар». Нацыянальны дзень Расіі. Пасля заканчэння — НІКа. Мастацкі фільм «Арфей».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

5.00, 8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00. Новости. **5.20.** Утренняя гимнастика. **5.30.** Утро. **7.45.** Фирма гарантирует. **8.20.** «Майский снег». Художественный фильм для детей. **9.30.** Олеся и компания. **10.00.** Клуб путешественников. **10.50, 01.20.** Пресс-экспресс. **11.20.** Америка с М. Таратутой. **11.50.** «Путь героина». Художественный телефильм. **12.40.** «Мелочи жизни». Художественный телесериал. 5-я и 6-я серии. **13.40.** Мультфильм. **14.25.** «Бридж». **14.50.** «Бизнес-класс». **15.05.** Джэм. **15.35.** В мире животных. Фильмы режиссера А. М. Згуриди. «Белый клык». **17.20.** Межгосударственный телеканал «Останкино» представляет программу «Мы хотим жить». **17.40.** Погода. **17.45.** Человек и закон. **18.15.** Америка с М. Таратутой. **18.45.** «Поле чудес». **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Человек недели. **20.55.** Премьера художественного телефильма «Суини». 4-я серия. **22.50.** «ВИД» представляет: Площадка обоза. Концерт Валерии, «Автошоу». **23.20.** Международный конкурс популярной музыки «Юрмала-93».

КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.20.** Телевизионная биржа труда. **7.30.** Время деловых людей. **8.00.** Параллели. **8.15.** Кабаре «Околесица». **9.10.** «Новосибирск. Век первый». К юбилею города. **11.10.** Домашний экран. Художественный телефильм «Санта-Барбара». 196 серия. **12.00.** Сам себе режиссер. **12.30.** Мульти-пульти. «Уважаемый леший». **12.40.** Крестьянский вопрос. **13.25.** Белая ворона. **14.10.** Премьера документального фильма «Верю в Будду». **15.00.** Телебиржа. **15.30.** Там-там новости. **15.45.** Студия «Рост». «Старая мельница». **16.15.** Трансросэфир. «Погасшая звезда?». **16.45.** «История неначавшейся войны». **16.55.** Дисней по пятницам. «Гонка на выживание». Художественный фильм. **17.45.** Парламентский час. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55, 19.20, 21,55.** Реклама. **19.25.** Любимые комедии. «Афоня». Художественный фильм. **20.55.** «К-2» представляет: «Абзац». **22.20.** Автомиг. **22.25.** Спортивная карусель. **22.30.** ІІ Международный музыкальный фестиваль «Славянский базар». Национальный день России. Трансляция из г. Витебска. **00.00.** Звезды говорят. **00.05.** Тишина № 9.

ПОЛЬША-I

13.00. Новости. **13.10.** Программа дня. **13.15.** «Таинственный пришелец». Фильм пр-ва США. **14.40.** Рядом с нами. **16.15.** «Князь Дакала». Сериал пр-ва Англии. **16.40.** «Неустрашимые». Сериал пр-ва Канады. **17.05.** Цветное лето. **17.50.** Музыкальная программа. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Тележурнал каникул. **19.00.** Свидание «в темную». **19.45.** Сатирическая программа. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «Четыре маленькие женщины». Сериал пр-ва Италии. **23.00.** Репортаж. **23.45.** Вечерние новости. **00.00.** Музыкальная программа. **00.05.** Горячая линия. **00.15.** «Гражданская война». Сериал пр-ва США. **01.25.** «Неуловимая банда». Сериал пр-ва Франции. **02.45.** «Сменщицы». Сериал пр-ва Польши.

24,СУББОТА

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 21,30.** Пад купалам сусвету. **8.25.** Мастацкі фільм «Арфей» **10.05.** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-93 (Мінск) — «Фандок» (Бабруйск). 2-гі тайм. **10.55.** Канцэрт студэнцкіх калектываў — удзельнікаў фестывалю «Студэнцкая вясна-93». **12.15.** «На шляху да незалежнасці». Перадача 5-я. **12.45.** «Матылькі высакагор ´я». Тэлефільм. **13.05.** Абрыс. «Сава мінервы прыручана...» **13.40.** «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Мастацкі фільм. 5-я серыя. **14.45.** Дзённік Прынёмання (Гр.). **15.00.** У святочным карагодзе. Народны ансамбль «Нёман». **15.45.** Пік. Відэаканал для падлеткаў. **16.30.** Да Дня незалежнасці. «Край». Гродна. **17.00.** Урачыстае пасяджэнне і канцэрт, прысвечаныя Дню незалежнасці. **20.40.** Калыханка. **21.00.** Панарама. **21.40.** Стоп-кадр. Крымінальная хроніка. **22.00.** НІКа. **22.15.** «Шчаслівчык», «Стрэлачнік». Мультфільмы для дарослых. **22.30.** ІІ Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.00, 14.00, 20.00, 22.50. Новости. **6.25.** Утренняя гимнастика. **6.35.** Пресс-экспресс. **6.45.** Субботнее утро делового человека. **7.30.** Спорт-шанс. **8.00, 22.45.** Погода. **8.05.** Марафон-15 представляет: «Зов джунглей». **8.30.** Эльдорадо. **9.00.** Автограф по субботам. В Высоцкий. **9.30.** «Она жила чувством и красками». Художник Мария Ломакина. **9.45.** Авиакосмический салон. **10.00.** Музыкальный киоск. **10.30.** Мы из МЭИ. **11.30.** Лица власти. **11.45.** Охранная грамота. **12.15.** Непутевые заметки, или путешествие с Соней в поисках Америки. **12.40.** Такое вот кино... В. Ежов. Писатель. Кинодраматург. Передача 1-я. **13.15.** Миниатюра. **13.30.** Придет ли князь с востока? Азиатский цикл С. Алексеева. **14.25.** Премьера мультфильма «Принц и русалочка». **15.10.** Деньги и политика. **15.40.** Спортивная программа Ультра-си. **16.20.** Магия моды. **17.05.** «Смеяться, право, не грешно». **17.50.** Счастливый случай. **18.50.** Премьера художественного фильма «Рыцари Хьюстона» (США). Фильм 4-й. **19.40.** Спокойной ночи, малыши! **20.40.** Между-

художественного фильма «Голубое и серое». 4-я серия. **22.00.** Любовь с первого взгляда. **23.05.** Международный конкурс популярной музыки «Юрмала-93».

КАНАЛ «РОССИЯ»

«Возвращение». **8.25.** Студия «Рост». «Первый тайм», «Наш ералаш». **8.55.** Непознання Вселенная. **9.25.** Пилигрим. Российское бюро путешествий. **10.10.** Публицистическая программа «45». **10.55.** Телеэрудит. **11.00.** Домашний экран. «Мой младший брат». Художественный фильм. **12.40.** Крестьянский вопрос. «Сев». **13.20.** Козырная дама. **13.50.** «Сигнальный экземпляр». **14.00.** Зигзаг удачи. **15.00.** Уходящая натура. Программа Льва Аннинского. **15.45.** Театр одного художника. К. Сомов. **16.05.** К-2 представляет: «Звезды Америки». **16.35.** Футбол без границ. **17.30.** Театральный раз ´езд, «Увидим ли мы небо в алмазах? » **18.15.** Устами младенца. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55, 19.20, 21.55.** Реклама. **19.25.** «Одобрям». Бенефис писателя М. Мишина. **20.55.** Телеэрудит. **21.00.** Контрасты. **21.40.** Репортер. **22.20.** Автомиг. **22.25.** Звезды говорят. **22.30.** Спортивная карусель. **22.35.** Програма «А». **23.35.** Ночной сеанс». «Как тени мечутся в грозу». Художественный фильм.

ПОЛЬША-I

8.30. Информационно-хозяйственный журнал. **8.50.** Агрорынок. **9.15.** Из Польши. **9.35.** Все об огороде. **10.00.** «Зерно». Программа католической редакции для детей. **10.25.** Программа для детей. **12.05.** Повести о дикой природе. **12.30.** Семейный еженедельник. **13.00.** Новости. **13.10.** Телетеатр. «Прекрасная жизнь». **14.35.** Приключение в зоопарке. **14.55.** Фестиваль польского телевизионного творчества. **15.30.** Публицистическая программа. **15.55.** Лаборатория. **16.15.** Программа для подростков. **17.00.** Без обезболивания. **17.15.** Репортеры представляют. **18.00.** Телеэкспресс. **18.20.** Встреча. **19.10.** «День за днем». Сериал пр-ва США. **20.00.** Детский журнал. **20.10.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «В кривом зеркале». Комедия пр-ва США. **22.55.** Музыкальные награды Монте-Карло-93. **23.45.** Новости. **00.05.** Спортивная суббота. **00.45.** «Мартин». Фильм ужасов пр-ва США. **02.20.** Музыкальные награды Монте-Карло-93. **03.20.** «Сменщицы». Сериал пр-ва Польши.

25, ВОСКРЕСЕНЬЕ

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00. Раніца рэспублікі. **8.10, 20.30.** Пад купалам сусвету. **8.20.** Праграма перадач. **8.25.** «Падарожжа ў краіну Чаянава». Дакументальны фільм. **9.30.** Дзівосны свет». З жыцця насякомых. **10.00.** Паказвае Віцебск. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма. **11.00.** Тыдзень планеты. **11.15.** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Днепр» (Магілёў). 2-гі тайм; КІМ (Віцебск) — «Дынама» (Брэст). 2-гі тайм. **12.50.** Беспрацоўе: сацыяльны партрэт. Прамая лінія. **13.50.** «Кракакот». Мультфільм. **14.00.** «Мы такія розныя». Музычна-забаўляльная праграма з удзелам калектываў мастацкай самадзейнасці Кобрынскага раёна. **15.00.** Знаёмцеся: більярд. Перадача 3-я. **15.40.** ІІ Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар». Канцэрт ІІ тура. **18.20.** З панядзелка... Гаючая прырода. **19.00.** Сізбар-топ-10. **20.00.** Панарама. **20.40.** Калыханка. **21.00.** «Сон у руку, ці чамадан». Мастацкі фільм. **22.15.** «Калі б я быў маім татам».Мультфільм для дарослых. **22.30.** ІІ Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар».

КАНАЛ «ОСТАНКИНО»

6.00, 14.00, 17.45, 23.00. Новости. **6.20.** Утренняя гимнастика. **6.30.** Автошоу. **6.40.** Технодром. **6.50.** Мультфильм. **7.00.** «Час силы духа». **8.00.** «Центр». **8.30.** «С утра пораньше». Премьера мультфильма «Денвер — последний из динозавров». **9.00.** «Пока все дома». **9.30.** Тираж «Спортлото». **9.45.** Утренняя звезда. **10.35.** Военное ревю. **11.05.** Соло. **11.30.** Под знаком Пи. **12.20.** Новое поколение выбирает. **13.00.** Премьера мультфильма «Пиф и Геркулес». **13.10.** Премьера документального фильма «Подводная одиссея команды Кусто». **14.20.** Диалог в прямом эфире. **15.00.** Клуб путешественников. **15.55.** Живое дерево ремесел. **16.00.** Премьера мультфильмов «Каспер и его друзья». «Настоящие охотники за привидениями». **16.50.** «Панорама». Международная программа. **17.30.** Телелоция. **18.00.** Московский кинофестиваль. Итоги. Размышления... **19.00.** Погода. **19.05.** КВН-93. Международная товарищеская встреча между сборной командой СНГ и сборной Израиля. **21.00.** Итоги. **21.45.** Спортивный уик-энд. **22.00.** «Ныне». Религиозная программа. **23.20.** Футбол. Чемпионат России. «Динамо» (Москва) — «Уралмаш». 2-й тайм.


КАНАЛ «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Вести. **7.25.** «Анна Павлова». Документальный фильм. **7.50.** Лучшие игры НБА. **8.40.** Доброе утро. **9.10.** Студия «Рост», «Теле-шанс». **9.40.** Частная коллекция. **10.35.** Аты-баты... **11.05.** Киприс Мажейка. Репортажи из Южной Африки. **11.35.** «Я не люблю...». Документальный фильм о Владимире Высоцком. **12.40.** Шесть соток. **13.20.** «Не вырубить...» Ведущий — В. Коптев. **13.35.** В мире животных. **14.35.** Коробка передач. **14.50.** Чемпионат мира по автогонкам в классе «Формула-1». Гран-при Германии. **16.50.** Волшебный мир Диснея. «Новые приключения Винни-Пуха», «Черный плащ». **17.45.** - Великие цирки мира. **18.45.** Праздник каждый день. **18.55, 19.20, 21,55.** Реклама. **19.25.** Кинотеатр повторного фильма «Июльский дождь». **21.10.** У Ксюши. **21.40.** «Америка Владимира Познера». **22.20.** Автомиг. **22.30** ІІ Международный фестиваль «Славянский базар». **00.00.** Звезды говорят. **00.05.** Центр Стаса Намина.

ПОЛЬША-I

8.30. Сельскохозяйственная программа. **10.00.** «Дети Хендерсонов». Сериал пр-ва Австралии. **11.25.** Программа католической редакции. **11.55.** Документальный сериал. **12.45.** Телеконцерт пожеланий. **13.15.** С камерой среди зверей. **13.35.** Музыкальный ящик. **14.20.** В старом кино. **16.30.** Документальный сериал. **17.15.** Спортивная студия. **17.40.** Антенна. **18.00.** Телеэкспресс. **18.30.** «Династия». Серия 199. **19.30.** Семь дней — мир. **20.00.** Вечеринка. **20.30.** Главный выпуск новостей. **21.15.** «Жемчуг в короне». Сериал пр-ва Англии. **22.10.** Программа кабаре. **22.55.** Спортивное воскресенье. **23.45.** Песни православной церкви. **00.15.** «Сага рода Таира». Фильм пр-ва Японии. **02.00.** Развлекательная программа. **03.00.** «Сменщицы». Сериал пр-ва Польши.

АПОШНЯЯ СТАРОНКА



Фота А. УЛАДАСЕВІЧА

Рынак

Упершыню з таго часу, калі былі ўведзены беларускія «зайчыкі», іх неахвотна пачалі браць на рынку. Гандляры валютай, калі прапаноўвалі ім нашы купоны, адразу падымаюць кошт даляра. А ўвечары ўжо па ўсіх крамах вымяняныя расейскія грошы. Справа ў тым, што завозяць валюту ў асноўным з Расеі й на розьніцы курсаў (а ў нас ён вышэйшы) нажываюць капітал. І, вядома, беларускія грошы ім не патрэбны.

Кошт некаторых харчовых тавараў на гарадзенскім рынку ў мінулыя выхадныя:

Сьвініна, 1 кг — 900—3500 руб.
Бараніна, 1 кг — 1400—2000 руб.
Вэнджаніна, 1 кг — 900—4500 руб.
Сала салёнае, 1 кг — 1300—1500 руб.
Сала вэнджанае, 1 кг — 1700 руб.
Шынка собская, 1 кг — 1200—2500 руб.
Тлушч, 1 кг — 500—700 руб.
Масла, 1 кг — 1800 руб.
Яйкі, дзесятак — 250 руб.
Сыр «Расейскі», 1 кг — 1600—1800 руб.
Морква, 1 кг — 400 руб.
Бульба маладая, 1 кг — 250 руб.
Гуркі, 1 кг — 300—350 руб.
Памідоры, 1 кг — 780—1000 руб.
Рэдзька, пучок — 70—80 руб.
Цыбуля, пучок — 20—25 руб.
Вішні, 1 кг — 700 руб.
Парэчка, 1 кг — 500 руб.
Маліны, 1 кг — 800 руб.
Агрэст, 1 кг — 600 руб.
Чарэшні, 1 кг — 900 руб.
Суніцы, 1 шк.— 200 руб.
Сьлівы, 1 кг — 900 руб.
Перац зялёны, 1 кг — 1500 руб.
Трускаўкі, 1 кг — 1200 руб.
Лімоны, 1 шт.— 350 руб.
Мёд, 1 кг — 3000 руб.
Разынкі, 1 кг — 1600 руб.
Бананы, 1 шт.— 300—350 руб.
Абрыкосы, 1 кг — 1700 руб.
Ружы, 1 шт.— 150—400 руб.
Гарэлка, 1 бут.— 700—800 руб.
Даляр ЗША — 1130—1160 руб.

М. ЖЫЛЕЎСКАЯ.

Крымінальная хроніка

За мінулы тыдзень у вобласьці зарэгістравана 105 злачынстваў і 42 здарэньні, у тым ліку 14 цялесных пашкоджаньняў, адно згвалтаваньне, 2 разбоі, 5 рабаўніцтваў, 25 крадзяжоў дзяржаўнай і 42 асабістай маёмасьці.

У 31 дарожным здарэньні 10 чалавек загінулі й 27 атрымалі раненьні.

■

У суботнюю ноч два маладыя цыганы ў масках забраліся ў дом 75-гадовай пэнсіянеркі, якая жыве на хутары Селішча ў Ашмянскім раёне, пабілі яе й забралі 15 тысяч рублёў, харчаваньне й хатнія рэчы. На працягу сутак злачынства было выкрыта й абодва злодзеі затрыманы.

■

Праз суткі тры рабаўнікі на легкавым аўтамабілі пад ´ехалі да сьвінафермы, што ў вёсцы Косічы Навагрудскага раёна. Пагражаючы вартаўніку насільлем, яны вынесьлі з памяшканьня фермы трох парасят, якіх адразу забілі, пагрузілі ў легкавік і зьніклі.

■

У вёсцы Мікелеўшчына Мастоўскага раёна вайсковец тэрміновай службы, які прыехаў да бацькоў на пабыўку, адабраў наручны гадзіньнік у студэнта сельгасінстытута. Калі ж міліцыянты паспрабавалі затрымаць рабаўніка, той пачаў супраціўляцца і хацеў уцячы. Адзін з міліцыянтаў мусіў зрабіць чатыры стрэлы з пісталета, пасьля чаго рабаўнік спыніўся.

■

На працягу тыдня зброя яшчэ тройчы выкарыстоўвалася супрацоўнікамі міліцыі.

На вуліцы Славінскага ў Горадні супрацоўнікамі аддзела аховы вымушаны былі страляць у паветра, каб затрымаць злодзеяў, якія спрабавалі абакрасьці сталовую № 60.

На КПП «Брузгі» толькі два стрэлы ў гору спынілі «Масквіч», на якім п ´яны жыхар Ваўкавыска спрабаваў без чаргі выехаць за мяжу.

На вуліцы Чапаева зброя ўжывалася, каб затрымаць 22-гадовага праваадніка гарадзенскай чыгункі, які спрабаваў апоўначы згвалціць кабету.

■

Паведамленьні з розных раёнаў вобласьці сьведчаць, што на зьмену мэднай да нас прыйшла «ядавітая» ліхаманка. Амаль кожны тыдзень фіксуюцца крадзяжы ядахімікатаў. Гэтым разам скралі ядаў амаль на тры мільёны рублёў. Крадзежнікі сьпілавалі замок са склада калгаса «Ніва» Іўеўскага раёна.

На шчасьце, ня ўсе скрадзеныя ядахімікаты апынуліся за межамі Беларусі. Днямі затрыманы нэўдалы «камэрсант» з вёскі Вавяраны Астравецкага раёна, які вывез на ўласным матацыкле буйную партыю «ядаў» са складу мясцовай райсельгасхіміі.

■

У вёсцы Солы Гарадзенскага раёна быў падпалены драўляны дом, 83-гадовы гаспадар якога знаходзіўся ў шпіталі, на месцы здарэньня знойдзена бутэлька з гаручай сумесьсю.

Яшчэ адзін састарэлы чалавек, 89-гадовая жыхарка вёскі Ціневічы Карэліцкага раёна, пацярпела ад недабразычліўцаў. Падчас сваркі рабочая мясцовай райсельгасхіміі абліла яе хату бэнзінам і падпаліла. На шчасьце, пажар адразу быў ліквідаваны.

■

На памежжы ўсе парушэньні вывазу тавараў зарэгістраваны ў Воранаўскім раёне. На КПП «Беняконі» затрыманы КАМАЗ з Башкірыі, на якім перавозілі звыш 14 тон сухога малака.

У Пусяворах двое летувісаў на аўтамабілях ВАЗ-2106 і ЕРАЗ-768 спрабавалі вывезьці за межы Беларусі 300 кг мэднага дроту й тры матацыклы ММВЗ-31212.

Г. СЫСОЙ.

Нядзельныя замалёўкі

(Пачатак на 6-й стар.).

страціце. Іншыя з выглядам незадаволенасьці толькі на трэці запыт скажуць цану свайму тавару, калі й прададуць яго таньней, дык не на шмат. Уражаньне такое, што яны працуюць тут пад прымусам. Ім усё роўна, калі хто што купіць. Ёсць і такія, каму не па сабе ад справы, якую яны робяць. Яны стаяць, апусьціўшы вочы. Ім бы як мага хутчэй прадаць тавар, яны без ваганьняў зьніжаць кошт. Некаторыя рэалізуюць рэчы, якія можна ўбачыць у прамтаварных крамах горада, але ж запэўніваюць, што прывезены яны здалёк.

Дастаткова паназіраць, і заўважаеш, што наведвальнікі торжышча таксама адрозьніваюцца. Адны прыходзяць, каб купіць пэўны тавар. Другім, здаецца, усё роўна, што набыць, яны доўга ходзяць, выбіраюць. Трэція прыходзяць толькі для таго, каб пацікавіцца коштам на рэчы.

Зглададўшыся, гандляры дастаюць з кайстраў бутэрброды. Запіваюць гарбатай ці кавай, а некаторыя — гарэлкай і шампанскім. Продаж не спыняецца нават у час ежы. Дзень выдаўся гарачы. Нехта пакутуе ад смагі, набывае ў падлеткаў пляшку «Фанты» ці лёды ў шакаладнай глазуры за 150 рублёў. Хто жадае выпіць што-небудзь памацней, купляюць у гандляроў, якія стаяць абапал дарогі, што аддзяляе рэчавы рынак ад могілак, гарэлку ці віно. Тут жа прапануюць цыгарэты, піва. Між гандлёвымі шэрагамі шпацыруюць «мянялы» з банкнотамі ў руках. Яны могуць кожнаму жадаючаму абмяняць рублі на валюту й наадварот.

Можна сустрэць гандляроў, у якіх на адным плячы вісіць скураная куртка, на другім — спадніцы, а ў руках — залаты ланцужок.

Інфляцыя прывяла да таго, што на рынку некаторыя рэчы, напрыклад, вырабы з каштоўных мэталаў, электратавары, рэалізуюцца толькі за СКВ. Рублі, атрыманыя ад продажу тавараў, камэрсанты часьцей за ўсё абменьваюць на даляры, курс якога вагаўся да 1.300 да 1.700 «драўляных» за адзін даляр.

Добра ідзе купля-продаж джынсаў коштам ад 3,5 да 15 тысяч рублёў, спартыўных касьцюмаў па 12 000—26 000, скураных куртак па цане 42—50 даляраў, акуляраў па 1700—4000, красовак па 4200—12 000, джынсавых куртак па 12 500—19 000, жаночых купальных касьцюмаў па 4000—6000, маек па 1800—4900, шортаў па 3000—4300, аудыёкасэтаў па 1000—18 000, дзіцячага абутку па 1800—3500 рублёў. Сумуюць гандляры аўдыёмагнітафонамі, шапкамі з... футра, зімовых скураных куртак, цана на якія, дарэчы, 100 даляраў.

Дзьве гадзіны апоўдні. Прадаўцы падлічваюць атрыманыя грошы, кладуць у кайстры непрададзеныя рэчы, каб рэалізаваць іх у наступны раз. Пакупнікі сьпяшаюцца дахаты з набыткам, а той, хто нічога не купіў, зьбіраецца праз тыдзень ізноў паспрабаваць шчасьця. Пасьля сябе яны пакідаюць сапраўдны сьметнік: бутэлькі, кавалкі паперы, бітае шкло, кавалкі ежы, паліэтыленавыя пакункі й іншае.

У наступную суботу ўсё пачнецца ізноў.

А. ДУК.

Дапамога скаўтам

Яшчэ адну дабрачынную акцыю правёў гарадзенскі культурна-асьветніцкі фонд Бацькаўшчына. 245 тысяч рублёў было пераведзена на патрэбы гарадзенскіх скаўтаў, для якіх адчынены лягер у в. Котра. Сродкі пойдуць на набыцьцё садавіны й гароднiны, прагулку на рачным транспарце па Нёману, іншыя культурныя мерапрыемствы.

(кс).

«ПАГОНЯ»

Рэдактар С. АСТРАЎЦОЎ

Заснавальнік: культурна-асьветніцкі фонд «Бацькаўшчына»

Адрас рэдакцыі: 230023, г. Горадня, вул. Дамініканская, 1.
Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.
Газета выдаецца штотыдзень па пятніцах.
Індэкс 63124. Ліцэнзія № 465.
Фотанабор, афсэтны друк.
Гарадзенская вабласная узбуйненая друкарня: 230003, г. Горадня, вул. Паліграфістаў, 4.

Падпісана да друку 1?.7.1993 г.

Тыраж 3231 паасобнікаў. Замова 3368